Унукі вайны ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Фабіян Ярэміч ☞ I-III

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 33 (2727) Год LIII | Беласток, 17 жніўня 2008 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Князю Канстанціну

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

9 жніўня, у першы дзень свята Супрасльскай іконы Багародзіцы, у дзядзінцы Супрасльскай лаўры, была адкрыта выстаўка, прысвечаная князю Канстанціну Васілю Астрожскаму, а ў чарговы дзень свята, 10 жніўня, была ўстаноўлена — выкананая ў беларускіх майстэрнях — мемарыяльная дошка яму. У панядзелак, 11 жніўня, адбылася навуковая канферэнцыя, прысвечаная дасягненням князя — пра яе будзе адмысловы матэрыял. А вось пра выстаўку, якая на сарака карцінах паказвае род Астрожскіх і сёлетняе яго ўшанаванне ў Беларусі, папрасіў я расказаць яе галоўнага арганізатара ды — у шырокім кантэксце — пачынальніка многіх іншых асветных мерапрыемстваў, старшыню Фонда імя Канстанціна Астрожскага Анну Радзюкевіч:

— Наш фонд мае сваім патронам князя Астрожскага, сёлета мінае 400-я гадавіна ягонай смерці, а гэта нагода для папулярызацыі ведаў пра яго. Не ўсе ж чытаюць кнігі, некаторыя адно тэлевізары аглядаюць. А мне думалася больш спапулярызаваць веды пра яго і з таго вывад, каб запрэзентаваць іх у форме выстаўкі. Я ўжо многа разоў была на Беларусі, шмат разоў у Астрогу, а там менавіта захавалася найбольш слядоў з жыцця князёў Астрожскіх, тады не было мне так складана зрабіць такую выстаўку. Ну, вядома, фотаздымкаў у мяне назбіраліся сотні, але ж трэба было выбраць такія, якія распавядалі б пра род Астрожскіх, а прадставіць гэта на сарака фотаздымках не так проста. І найбольшы націск трэба было паставіць на прэзентацыю менавіта князя Канстанціна Васіля Астрожскага. Але я падумала, што лепш яго паказаць на фоне ягонага роду і крыху на фоне дзяржавы. Таму выстаўка пачынаецца з прэзентацыі роданачальнікаў, ад князя Данілы, які першапачаткова пражываў у Вільні. Пасля святы Фёдар, які спачыў у Кіева-Пячэрскай лаўры, за ім бацька нашага Канстанціна Васіля — Канстанцін Іванавіч Астрожскі, які ў 1514 годзе атрымаў вялікую перамогу над маскоўскім войскам пад Оршай. Далей даходзім да самога князя Канстанціна Васіля, які вынес род Астрожскіх у апагей адукаванасці, багацця і славы. Выстаўка таксама паказвае завяршэнне гісторыі роду Астрожскіх — Анну Алаізу Хадкевіч, якая была ўнучкай Канстанціна Васіля, дачкой ягонага сына Аляксандра. Яна вельмі моцна звязалася з Ісусавым таварыствам і пачала засноўваць фонды для падтрымкі гэтай арганізацыі. Гэта не было б істотнай справай, калі б яна не знішчала здабыткаў свайго дзеда. Яна мела права развіваць сваю культуру — яна была выхавана ў каталіцызме — але балючае тое, што яна паралельна знішчала цэлы плён працы князя Канстанціна Васіля, а перш за ўсё спыніла фінансаванне Астрожскай акадэміі ды друкарні. Хаця запіс у запавеце князя быў такі, каб гэтыя суб'екты заўсёды падтрымліваць. І ўжо ў 1630-1640-х гадах так друкарня, як і акадэмія былі закрыты. І тады славуты Астрог страціў сваё значэнне. Гэтым канчаю аповед пра род, а пачынаю пра святкаванне. Так атрымалася, што найбольшыя ўрачыстасці — мяркую, што за ўсе чатырыста гадоў на прасторы ўсіх спадчынных роду Астрожскіх дзяржаў, г.зн. Польшчы, Літвы, Беларусі і Украіны — адбыліся ў Беларусі ў днях 9-13 мая г.г. Адбыліся яны ва ўсіх мясцовасцях, звязаных з жыццём і дзейнасцю князя Канстанціна Васіля Астрожскага, а гэта маёнтак Тарасава каля Мінска, гэта Тураў на Прыпяці, дзе нарадзіўся наш князь, гэта і Бярэсце...

— А як патлумачыць своеасаблівае спазненне адзначання гадавіны смерці князя, бо ж ён памёр 21 сакавіка, а святкаванні, так у Беларусі як і ў нас, адбываюцца пазней?..

— Гэта крыху не так, бо так у Беларусі як і ў нас у дакладную гадавіну смерці князя адбыліся малебны ў цэрквах, калі мы духоўна ўшаноўвалі ягоную памяць. Да таго ж у той час у Беларусі была адкрыта вялікая выстаўка друкаў эпохі князя Астрожскага, якую наладзіла Нацыянальная бібліятэка Беларусі ў Мінску. І дакладна ў той жа час упершыню прагучала кантата ў гонар князя, якую напісала Ганна Казлова на словы Герасіма Сматрыцкага — князевага сучасніка. Святкаванні пачаліся тады, але каб да іх прыцягнуць больш народу, прадоўжылі іх на май. Беларускія арганізатары запрасілі таксама гасцей з замежжа: з Літвы, Расіі, Украіны, Польшчы. Мы таксама пачалі святкаванні раней, бо выпусцілі каляндар у дадатак да „Праваслаўнага агляду", прысвечаны князю Астрожскаму. У пачатку лютага ладзілі мы „Бяседу з князем", дзе таксама прэзентавалі дзейнасць князя. Ну, а цяпер у Супраслі вялікае свята і таму паказваем выстаўку тут.

— Ці тут толькі Вашы матэрыялы, ці некаторыя матэрыялы з Беларусі?

— Гэта нашы ўласныя матэрыялы і часткова выкананыя на наш заказ. Вось шмат здымкаў для нашай выстаўкі выканаў Анатоль Кляшчук з мінскай газеты „Звязда", які ў сваім творчым дасье мае некалькі альбомаў мастацкай фатаграфіі.

— Мяне крыху здзіўляе, што адзначаеце гадавіну менавіта смерці князя Астрожскага, гадавіну вялікай праваслаўнай страты, бо ён жа быў апошнім знатным абаронцам праваслаўя ў Рэчы Паспалітай.

— Адзначанне гадавіны смерці вельмі тыповае для Царквы, бо смерць, гэта ж нараджэнне для вечнага жыцця. У Царкве — у адносінах да ўсіх святых — адзначаецца дзень прадстаўлення перад Богам, дзень смерці; ніколі не святкуецца дня нараджэння, бо чалавек родзіцца для марнасці мірскога жыцця, а адыходзіць у Царства нябеснае. Род князя Астрожскага спыніў сваё існаванне, але гэта не абазначае, што людзі спадчыны Вялікага Княства Літоўскага забыліся пра яго, яны надалей прадаўжаюць ягоную справу.

Слова гонару ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Жывучы ў XXI стагоддзі, мы патанаем у акіяне інфармацыйнай прасторы. Людзі захлынаюцца ў віры і віхуры слоўнай плыні, моўнай эквілібрыстыкі і прапаганды, рэкламы і палітычнай траскатні. Мы цэлы час спяшаемся — дарабіць недаробленыя справы...

Еўрапейскае грамадства з рэгіянальнымі нацыямі ☞ 2

Міхась КУПТЭЛЬ

Не ведаю ці ў Еўропе маецца яшчэ такое грамадства як беларускае. Пішу грамадства, а не нацыя, таму што жыхароў Еўрапейскага Саюза чакае ўніфікацыя і народаў проста не будзе. З часам атрымаецца еўрапейскае грамадства з рэгіянальнымі нацыямі...

Новыя мяшчане ☞ 4

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Алесь Тарановіч ☞ 5

Ганна КАНДРАЦЮК

Іаанна Корх ☞ 8

Аляксей МАРОЗ

Слова гонару

...слова тваё хай ашчаднае будзе
Кніга Эклезіяста

Жывучы ў XXI стагоддзі, мы патанаем у акіяне інфармацыйнай прасторы. Людзі захлынаюцца ў віры і віхуры слоўнай плыні, моўнай эквілібрыстыкі і прапаганды, рэкламы і палітычнай траскатні. Мы цэлы час спяшаемся — дарабіць недаробленыя справы, узваліць на сябе новыя, сустрэцца з дзесяткамі людзей, паспець на цягнікі і аўтобусы, знайсці час для сям'і, пабываць у сябра на дні нараджэння, трапіць на імпрэзы, куды табе ўжо не хочацца, але абавязкова трэба быць. І так дзень за днём...

Раней чалавек, заходзячы ў салун, даставаў два кольты і клаў іх на стол. Гэтыя пісталеты былі пэўным гарантам таго, што ніхто не патрывожыць яго ў час абеду. Цяпер жа, заходзячы ў бар ці кавярню, ён дастае два мабільныя тэлефоны і кладзе іх перад сабой. Без тэлефанаванняў ён не можа нават паабедаць. Ізноў ідуць новыя абяцанні і запэўніванні выканаць у тэрмін абавязкі. Ізноў чалавек не ў змозе гэта рэальна паспець. Ізноў ён падманвае самога сябе, бо, як кажуць у народзе, сліны не падымеш, а слова вернеш. У выніку доўжыцца дэвальвацыя „слова гонару".

Найменш сёння значыць слова ў палітыцы, асабліва ў вялікай палітыцы. „Калі ўсе вакол прамаўляюць аб міры, значыць, справа ідзе да вайны". Так здарылася і ў Паўднёвай Асеціі, дзе палітыкам намнога важней дзяржаўныя амбіцыі, чым людскі лёс. А інфармацыі пра гэтую вайну столькі, што галава ідзе кругам, прычым звесткі падаюцца настолькі супярэчлівыя...

Няпраўда, што некалі, за савецкім часам, не было інфармацыі. Насамрэч яна была. Трэба было глядзець тэлевізар, ці слухаць радыё, і рабіць адваротныя высновы пачутаму. Прыкладам, калі казалі, што ў якой-небудзь афрыканскай краіне прыйшла да ўлады „прагрэсіўная частка грамадства", якая вызнае ідэі сацыялізму, то гэта азначала, што пры дапамозе грошай ці зброі СССР здзейснены путч і ўсталёўваецца новая жорсткая дыктатура. Пазней выяўлялася, што ў той афрыканскай дзяржаве ўладу захоплівала бандыцкая групоўка на чале з якім-небудзь канібалам. Формула атрымання праўдзівай інфармацыі „праз адваротнае" была абсалютна беспамылковай. Нешта падобнае назіраецца і сёння, бо атрымаць хоць больш-менш аб'ектыўную інфармацыю з беларускіх ці расійскіх медый папросту немагчыма.

З 1994 года ў Беларусі безупыннай плынню ліюцца салодкія абяцанкі ўлады. Можа ў Бельску ці ў Белгарадзе многія і вераць прапагандзе, але рэальна ў Беларусі людзі не адчуваюць экраннага „сацыяльнага раю". Ды падман стаў галоўнай існасцю і адзінай формай існавання беларускай дзяржаўнай улады. Узяць хоць бы дэкларацыю стварыць роўныя магчымасці для ўсіх палітычных сіл на выбарах — на справе ж усё інакш. Калі беларуская ўлада хлусіць народу, то беларуская апазіцыя звыкла падманвае сама сябе. Але мінулы тыдзень якраз быў незаўважна, але, на маю думку, яскрава вельмі пераломным у гэтым сэнсе. Адбыліся з'езды большасці дэмакратычных партый. І многія рэчы ўпершыню былі абвешчаны адкрыта, а маскі скінутыя. Так Партыя камуністаў Беларуская дэкларавала, што на бягучых выбарах пры кожных абставінах будзе весці кампанію да апошняга дня. Партыя БНФ яшчэ раз прадэманстравала, што ў ёй зараз існуюць дзве прыблізна роўныя паловы з рознымі мэтамі. І хоць расколу не адбылося, але падзел гэты відавочны. Адна з плыняў абвяшчае, што на будучых прэзідэнцкіх выбарах, упершыню з 1994 года, будзе ставіць на свайго партыйнага кандыдата, іншая ледзь не ўпершыню адкрыта заявіла, што мае намер зноў рабіць стаўку на Аляксандра Мілінкевіча. Партыя АГП дэкларавала, што адной з яе прыярытэтных мэт стане гендэрная палітыка (тым самым падкрэсліваецца агульнаеўрапейская тэндэнцыя, нягледзячы на зусім іншыя беларускія рэаліі і актуаліі). Ну, а найбольшай радыкальнасцю вызначыліся сацыял-дэмакраты, якія падзяліліся чарговы раз і ў выніку скінулі з пасады свайго старшыню Аляксандра Казуліна, які па-ранейшаму сядзіць у турме за ўдзел у прэзідэнцкай кампаніі. Тут ужо каментарыі зусім непатрэбныя. А ўвогуле, уся апазіцыя, на маю думку, не мае маральнага права браць удзел у нейкіх выбарах (тым больш ісці на іх да канца), пакуль у краіне ёсць палітвязні. І ці ёсць яшчэ ў нас тое „слова гонару"?

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Еўрапейскае грамадства з рэгіянальнымі нацыямі

Не ведаю ці ў Еўропе маецца яшчэ такое грамадства як беларускае. Пішу грамадства, а не нацыя, таму што жыхароў Еўрапейскага Саюза чакае уніфікацыя і народаў проста не будзе. З часам атрымаецца еўрапейскае грамадства з рэгіянальнымі нацыямі. Новы Лісабонскі дагавор прадбачвае еўрапейскі ўрад, міністра замежных спраў, ну, і прэзідэнта.

Паколькі беларусы гэта грамадства, а не нацыя (глядзі фельетоны С. Яновіча ці В. Сазонава), таму ўжо цяпер, а не ў будучыні павінны яны стаць часткай еўрапейскай сям'і.

Уніфікацыя нацый у былым Савецкім Саюзе адбывалася дзесяткамі гадоў. Выраслі новыя пакаленні, якім саветчына — гэта нармальная з'ява, якая ўкаранілася ў іх свядомасць, так што іншага яны і не ўяўляюць. Ім усё роўна, ці будуць размаўляць між сабой па-беларуску ці па-руску. Руская мова паўсюдна гучыць у беларускім эфіры — яна нават чутна і на Радыё Рацыя, дыктары якога быццам гавораць па-беларуску, аднак з няродным вымаўленнем. Яна царыць і ў прэсе. Калі нехта і адазвецца па-беларуску, то найчасцей гэта або нейкі вясковец, або апазіцыянер, для якіх няма ніякай пашаны.

Чытаю ў „Часопісе", што ў будучым годзе на Беларусі вучні не будуць вывучаць гісторыю Беларусі, толькі гісторыю свету. Па-мойму, улада, а затым і прэзідэнт Лукашэнка, хочуць падрыхтаваць новае пакаленне беларусаў да жыцця ў Еўропе. Не быў бы Лукашэнка прэзідэнтам, калі б не прадбачваў будычыні. Проста ідзе ён следам вандроўнага ліцэя спадара Уладзіміра Коласа, які пакуль што вандруе па еўрапейскіх дзяржавах, каб наблізіцца да іх і прызвычаіцца ў іх існаваць. А што прэзідэнт не любіць канкурэцыі, то хто яе любіць, калі справа ў гістарычным пераломе ў дзяржаўнай беларускай палітыцы. Ён так бачыць светлую еўрапейскую будучыню, як некалі бачыў князь, а потым кароль Ягайла. Тады паўстала унія, то чаму не можа паўстаць цяпер з удзелам Беларусі.

Зусім не разумею, чаму прэзідэнта Лукашэнку і яго каманду не ўпускаюць у Еўропу. Ужо цяпер ён з'яўляецца кіраўніком беларусаў як адной супольнасці. А што прытым людзі не маюць нацыянальнай беларускай свядомасці як праявы культурнай тоеснасці, толькі пакуль што маюць савецкую свядомасць... То ці ж гэта перашкода, каб прыхіліцца да грамадства Еўрасаюза? Вядома, што не. Калі „бацька" скажа, што так трэба, то людзі, каму як каму, але яму паверацъ, так як вераць яму цяпер, а не якімсьці там нацыяналістам.

Нацыянальнасць як ідэя, ці як пэўная супольнасць людзей, якія жывуць на пэўнай тэрыторыі і размаўляюць між сабой на зразумелай сабе мове, вераць у гэтага самага Бога, маюць гістарычную памяць, была выдуманая не так даўно. А калі ідэя нацыянальнасці стварыла перш за ўсё еўрапейскія народы, і калі замала было ім жыццёвай прасторы, то, як вядома, сталі яны сварыцца між сабой за раздзяляючыя іх межы, а потым ваяваць. Калі суседзі Паўляк і Каргуль сварыліся за мяжу, якая раздзяляла іхнія вузкія палеткі, то ад касы Паўляка пацярпеў Казьмеж. Але калі сварацца народы, як у Югаславіі, то трагедыя непазбежная. Не трэба чытачам прыпамінаць, якой гекатомбай аказаліся І і ІІ сусветныя войны, прычынай якіх быў недастатак жыццёвай прасторы для пэўнага атуманенага народа.

На шчасце ў адзін перыяд у некалькіх еўрапейскіх дзяржавах урады ўзначалілі светлыя людзі, якіх цяпер называюць дзяржаўнымі дзеячамі (mężami stanu) і якім нацыянальнасць не засланіла вачэй ды не замуліла мазгоў. Менавіта яны стварылі еўрапейскую супольнасць, спачатку дзяржаў, а потым народаў, пад адзінай мажлівай ідэяй — ідэяй дэмакратыі і свабоды.

Вядома, што беларусам патрэбныя дэмакратыя і свабода. Сучасныя кіраўнікі еўрапейскай супольнасці кажуць, што калі ў Беларусі будзе дэмакратыя і свабода, тады прымуць яе ў еўрапейскую сям'ю дваццаці сямі дзяржаў Еўропы. Па-мойму, праблему трэба паставіць наадварот: тады ў Беларусі ўсталююцца дэмакратыя і свабода, калі беларуская грамадскасць далучыцца да еўрапейскай сям'і.

І такой канстатацыяй хачу закончыць гэты допіс, бо, як кажуць беларускія студэнты, чакаць змен дзесяць або дваццаць гадоў — гэта ўжо не мая перспектыва.

Пачаў я іранічна, а атрымалася зусім сур'ёзна. І так бывае.

Міхась КУПТЭЛЬ

Вачыма еўрапейца

Віртуальны стол

— Гэта злоўжыванне, а нават скандал, — гаварыў мне ў апошні час абураны, прачытаўшы адну публікацыю на першай старонцы адной з агульнапольскіх газет адзін мой знаёмы з польскага МЗС. Таму заглянуў я ў артыкул аб якім ён успамінаў. „Беларуская апазіцыя хоча да вераснёвых выбараў дагаварыцца з дыктатарам Аляксандрам Лукашэнкам. Памагчы мае ў гэтым... Лех Валэнса. Лідэры апазіцыі заклікаюць у [... тут прагучаў загаловак газеты — М. Х.], каб былы польскі прэзідэнт стаў негацыятарам пры беларускім круглым стале" , — я чытаў пралупліваючы вочы. З тэксту выразна вынікала, што за круглым сталом перад парламенцкімі выбарамі ў Беларусі і за негацыятарам у асобе Леха Валэнсы адназначна і аднагалосна выказваюцца найбольш значныя лідэры апазіцыі: Станіслаў Шушкевіч, Аляксандр Мілінкевіч, Вінцук Вячорка, Анатоль Лябедзька.

Неяк не хацелася мне ў гэтыя весткі ўверыць. Наколькі пільна сачу за сітуацыяй у Беларусі, таксама ў шырэйшым міжнародным кантэксце, дык любы круглы стол з удзелам улады і апазіцыі пакуль там немагчымы. Няма гарантыі, што вераснёвыя выбары будуць поўнасцю дэмакратычнымі. Якраз уступіў у сілу рэстрыкцыйны медыйны закон, значыць, марнымі з'яўляюцца шанцы на свабоду слова. Хоць бы толькі з-за гэтых дзвюх прычын цяжка мне ўявіць, аб чым мелі б гаварыць за круглым сталом.

Назаўтра ў іншых газетах я прачытаў каментарыі саміх быццам бы зацікаўленых круглым сталом. Станіслаў Шушкевіч: „Гэта вялікая бязглуздзіца. Не было і няма ніякага супольнага закліку да арганізавання круглага стала Гэта мана". Аляксандр Мілінкевіч: „Год таму я звяртаўся да ўлад з адкрытым лістом, у якім прапанаваў распачацце пертрактацый. Гэта нічога не дало. Няма чаго паўтарацца. Дэмакратычная апазіцыя не прапанавала ўладзе круглага стала. Гэта пошукі таннай сенсацыі!". Анатоль Лябедзька: „У такіх умовах зразумела, што ўладзе не залежыць на ніякіх пертрактацыях". Вінцук Вячорка: „Я не выступаў з заклікам правядзення такой сустрэчы. Непрадуманыя заявы аб безумоўнай гатоўнасці еўрапейскіх арганізацый і дзяржаў да распачацця дыялогу з Лукашэнкам маццюць яго ў перакананні бяскарнасці і становяцца адной з прычын росту рэпрэсій".

Пасля гэтых выказванняў для мяне ўжо стала ясным, што інфармацыя агульнапольскай газеты аб круглым стале гэта баўтун. Нават падумалася мне, што гэта правакацыя або дурнота, якая вынікае — як казаў Аляксандр Мілінкевіч — з пошукаў таннай сенсацыі. Пасля ўжо зусім мне рукі апусціліся, калі прачытаў выказванне на тэму „сенсацыйнага" артыкула шэфа замежнага аддзела газеты, якая яго апублікавала:

— Была гэта з нашага боку спроба заахвочання беларускай апазіцыі да перамоў з прэзідэнтам Лукашэнкам.

А я сабе думаю, што гэтая спроба была прынамсі як — як кажа моладзь — урэзацца паміж гарэлку і закусь.

У гэтай усёй саромнай справе шкада мне прэзідэнта Леха Валэнсы, якога, як мне здаецца, найпрасцей зманіпулявалі і выкарысталі. І прыпомнілася мне ягонае інтэрв'ю, якое даў ён „Ніве" больш года таму. Гаварыў ён тады між іншым:

— Я правёў шмат размоў з панам Лукашэнкам. Сцвярджаю, што ён не кажа таго што сапраўды думае. Ён іграе лісіцу-хітрыцу. Бачыць, што зацікаўленне Беларуссю кепскае, а з былых краін СССР падпарадкаванне яе Расіі і так найбольшае. Хоча пачакаць, аж Захад стрымаецца, упарадкуецца, яшчэ больш пашырыцца і ў той час нічога яму не ўцячэ. Пан Лукашэнка спачатку спрабуе выдаіць Расію, пасля неяк зарабіць і на Захадзе.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Унукі вайны

”Жыццё так кволае, але канца не відаць,
не ты рашаеш дзе гарызонт,
тонкая лінія вядзе праз жыццё”
гурт 5сот5

Коля Харкевіч з Лешукоў у 85 гадавіну з дня нараджэння

Дзіма Бабкоўскі са Снова

Ілона КАРПЮК

Памяць пра час вайны заціраецца, прападае ўжо большасць слядоў мінуўшчыны. Памяць з гадамі штораз слабейшая, памірае з нашымі прадзедамі, дзядамі і бацькамі. Час ад часу ажывае ў кніжках, а ў розных кшталтах жыве ў сямейных расказах. Маладыя людзі ад гэтага зусім далёка. Часам толькі выпадкова гісторыя вяртаецца пры святочным стале.

У маёй галаве ваенныя расказы жывуць вырэзкамі. Калі ў ліцэі ездзілі на этнаграфічныя рэйды, вайна сыходзіла на другі план, бо якраз гэта быў апошні момант слухаць і збіраць расказы пра бежанства. У маёй сям’і таксама ў бежанства з’язджалі, але не самыя бліжэйшыя, то і гэтыя гісторыі жылі дзесьці побач. Вайна вярнулася пару гадоў пазней, калі з беларускай моладдзю тыдзень часу кружылі па Кленіцкай зямлі і слухалі пра партызан ды ваенныя падзеі. Тады дайшло і да мяне, што дзяды таксама пасмакавалі вайны, не толькі ў выніку кантакту з арміямі, што пераходзілі праз вёску то ў адзін то ў другі бок, высялялі, палілі, а таксама таму, што і мае продкі з карабінамі ішлі на Берлін.

Дзед свайго ўнука

Мой дзед Коля Харкевіч замнога пра вайну не расказваў, бо з ім нялёгка гаварыць. Ад кулі на некалькі дзён страціў слых у адным вуху, нібыта потым слых яму вярнуўся, але пару дзесятак гадоў прыйшло дзеду жыць у сваім свеце. Сёння, каб нешта яму сказаць, пішам усё на лісце, але бывае, што такія размовы працягваюцца і паўгадзіны, і гадзіну.

Дзед Валодзя Іванюк таксама пра вайну зашмат мне не расказаў. Калі памёр у 1998 годзе, я толькі што пачала цікавіцца першай вайной, санацыяй ды беларускасцю. Дзед любіў жыццё, то і мы раней з ім весела жылі, нават не ведаючы, што памёр з асколкамі куляў у целе.

Павал свайго дзеда Янку Азяблу ніколі не пазнаў. Ён нарадзіўся ў 1986 годзе, дзеда не было на свеце ўжо 13 гадоў. Але калі я ўспомніла, што гаварыла з яго бабуляй пра яе жыццё, пра вайну, пра дзеда, то зразу спытаўся, ці ведаю пра тое, што ўсё магло быць інакш. Магло быць так, што дзед не вярнуўся на сваё. Ды галоўнае, што Павал пра гэта ведае.

Бартак свайго дзеда Дзіму Бабкоўскага пазнаць гадамі не мог. Сноў — гарадок на Баранавіцкай зямлі, адтуль родам Барткава бабуля і яе брат, Дзіма. Ужо перад вайной іхнія дарогі вялі на захад, яе — у Старасельцы, яго — у Варшаву, але вайна і мяжа раздзяліла іх амаль на ўсё жыццё. Шчасліва бацька расказваў пра Дзіму шмат, таму Бартак добра ведае, што вайна падрыхтавала сям’і яго бабулі пекла.

З Паўлам і Барткам я пазнаёмілася ў 2005 годзе, калі абнаўляўся гурт 5сот5 — спалучыла нас музыка, супольнае ігранне, гульні, канцэрты. У час рэпетыцый няма часу размаўляць пра іншыя справы чым музыка, ну, можа часам хлопцы скажуць яшчэ пару слоў пра дзяўчат. Гэтыя тэмы развіваюцца ў дарозе на канцэрты, пры піве ды іншых сустрэчах. Для маладых людзей гэта так важнае, што няма месца на іншыя тэмы. Адзін намерваецца купіць машыну, другі рыхтуецца да экзаменаў, трэці развітаўся з дзеўкай, якая з’ехала за працай у Англію, наступны рассуджвае сяброўскія сваркі. У час вайны нашы дзяды гэтым не займаліся. Аказалася, што мы ўсе добра пра тое ведаем, а тэму закранулі толькі раз, у машыне, вяртаючыся з рэпетыцыі. Хапіла гэтага штуршка, каб дабрацца да сямейных успамінаў.

Прэлюдыя

Дзіма Бабкоўскі, таленавіты малады хлопец захацеў вучыцца ў мастацкай акадэміі. Паехаў у Варшаву. Там яму сказалі, што прымуць яго ў школу, калі пяройдзе ў каталіцтва.

— Перайшоў, але толькі на паперы, — адзначае Андрэй, бацька Бартка, — не меў выхаду. Ды не скончыў школы, прыйшла вайна і трэба было вяртацца ў Сноў.

Першы кантакт з немцамі меў месца аднак тады, калі прыйшлі яны ў хату і казалі везціся фурманкай. Сям’я Бабкоўскіх мела цудоўную гадоўлю коней, вялікую гаспадарку і ... не мела выбару. Дзіма немцаў павёз, хаты яму не спалілі, сям’і не расстралялі, але вазака за калабарацыю рускія ўзялі ў армію. У той самы час Коля працаваў у Беластоку на шклозаводзе. Дзвесце грам хлеба на дзень, дзвесце пяцьдзесят тым, што цяжка працавалі, і пяцьдзесят грам мяса на тыдзень.

— Цяжка было, але давалі раду, — расказвае Коля Харкевіч. — Але калі прыйшоў немец і забіралі маладых у нямецкую армію, то я вырашыў уцякаць на бацькаўшчыну. Там на дзвярах распісана было, хто жыве ў хаце, але я быў прапісаны ў Беластоку.

Коля хаваўся так ад студзеня па жнівень 1944 года. Немцы прыходзілі раз за разам. Упершыню спыталіся пра Колю ў солтыса.

— Не прадаў мяне. Наш солтыс у Боўтрыках быў польскі, але быў добры чалавек.

Прыходзілі зімой, прыходзілі летам. Колеў дзядзька быў хітрун, то не раз не адчыняў дзвярэй. У канцы пачалі крычаць: „Дойчэ, дойчэ!” Тады дзядзька адкрыў тыя дзверы і сказаў: „Я думаў, што бандыты, а можа і партызаны якіясь!” Коля паспеў добра схавацца, але перад рускімі ў жніўні ніхто не схаваўся. Усіх загналі пад Свіслач, — там ужо планавалася мяжа, хто застаўся за мяжой то і трапіў у савецкую армію; бралі да 60 гадоў. Коля заранёў вырашыў з дваюрадным братам збегчы. Як сам сказаў, не паспелі нават іх пастрыгчы. Валодзю ў гэты час забралі немцы ў Прусію на работы. Пушчанскія вёскі або палілі, або перасялялі, або людзей забіралі на работы. Вядома, што калі ішлі саветы, тых, што працавалі для немца забіралі адразу ў армію. Асобным выпадкам быў дзед Паўла. Янка ішоў з арміяй з Расіі — на Берлін. Да канца.

Праз пекла

Нам, маладым, нават у галаву не прыйшло, што нашыя дзяды дзесьці маглі сустрэцца, хаця яны з розных вёсак Падляшша. Ішлі яны ў гэты сам час, з такой самой мэтай. Коля і Янка ішлі ганарова з Касцюшкоўскай арміяй.

— Калі „касцюшкоўцы” прыйшлі, то хлопцы народжаныя ў 1921-24 гадах ішлі прымусова, — расказвае Коля. — Ад нас з Лешукоў пайшлі яшчэ Кунцэвіч Коля, Валодзя Натальчын, мой дваюрадны брат Харкевіч Саша, а Зялінскі Валодзя дык патрапіў у рускую армію, але штось там зрабіў, то паслалі яго ў карную кампанію. А там як яго паранілі, дык зняслі і ён перайшоў да „касцюшкоўцаў”.

Так як і згаданага Зялінскага, паранілі ў карнай кампаніі дзеда Валодзю. Тры дні ішоў з фронтам, але з-за цяжкай раны да Берліна не дайшоў. Свайго шляху ў карнай кампаніі савецкай арміі не спыняў Дзіма Бабкоўскі. У апошнім лісце з фронту пісаў пра пекла вайны і пра пякельны лёс тых, хто ішоў у першай лініі. Развітваўся, хаця давялося яму здабыць Берлін. З „касцюшкоўцамі” здабыў яго і Янка, але з Берліна іхнія шляхі вялі зусім іншымі маршрутамі. Янка атрымаў шыкоўны дом і сад у Аполі. Мог застацца там або вярнуцца ў Рохенталь. Прыехаў на бацькаўшчыну, але ў галаве дзесьці там круцілася віла на Апольшчыне. Вырашыў застацца і на сваёй радзіме заснаваць сям’ю. Дзіма такога выбару не меў. Вярнуўшыся ў Сноў, нядоўга чакаў, калі савецкая ўлада пацягнула яго пад суд за калабарацыю з немцамі. Прысудзілі 20 гадоў у Сібіры. Пратрымаў карную кампанію, пратрымаў і Сібір.

— Дзядзька Дзіма быў цудоўным чалавекам, — расказвае Андрэй. — Таленавіты, выспартаваны, моцны і яшчэ з пачуццём гумару. Калі перад вайной хадзілі ў кіно і прапала святло, дык Дзіма выскокваў перад публіку і сам з сябе забаўляў людзей, лепш чым тое кіно! А дзякуючы талентам, ручным здольнасцям і такой унутранай сіле даў рады ў сібірскай няволі. Адпусцілі яго пасля шасці гадоў. Вярнуўся, вёў даволі выгаднае жыццё працуючы ў калгасе, але ніколі ўжо не ўсміхаўся. Ён, такі вялікі жартаўнік!

Кац па Берліне

Што сталася з Колем? Разам з „касцюшкоўцамі” таксама ішоў на Берлін. Надзел ежы ў фабрыцы памяняўся на надзел у арміі. Елі сушаную рыбу, сушаную капусту, час ад часу давалі ім амерыканскую банку тушонкі на чатырох, на абед даставалі яшчэ суп, часам бачылі бульбу. На нямецкай тэрыторыі было больш мяса, бо былі свінні, гусі і іншая жывёла, але пакуль тэрыторыя ворага, трэба было вызваліць Варшаву.

— Да вызвалення рыхтаваліся ў Рэмбертове, пабудавалі зямлянкі, спалі на голлі, мелі *цьвічэня*, а потым пайшлі вызваляць. Удалося, то і сарганізавалі парад, Берут быў і Роля- Жымерскі. Далі тры дні адпачынку, а далей на Быдгашч і Калабжэг. Атакавалі раз, потым адпачынак і праз пару дзён зноў *натарце*. Часам калі было цяжка, разбілі нас, то мы адыходзілі на тыл, а дзе *давудцы* стаялі з пісталетамі, то мусілі мы ісці далей. Мяне ранілі ў трэцяй атацы там пад Калабжэгам. Я быў у цэкаэмах, то нас было пяцёх: той, які цэліў, *тасьмовы* і трох амуніцыйных. *Націралі* якраз на малое мястэчка, а там у цукроўні сядзеў немец. Пацэліў ён так, што мяне параніла, адзін зразу памёр, прыбег санітар і спыніў кроў. А тады нас усіх пасадзілі на воз і накіравалі ў медпункт. А там так, ішла першая і шостая дывізія, як разбілі шостую, то яна разам з медпунктам перанеслася 20 кіламетраў далей. На адзін самаход, што вёз параненых, напалі і расстралялі, а мы на возе і вальней ехалі. Паспелі нас паведаміць, каб мы сцерагліся. Здаецца, з два тыдні ляжалі ў тым палявым шпіталі. Быў момант, што і адна з нямецкіх бандаў планавала атаку на той шпіталь; далі нам ужо нават карабіны, але дапамог нам рускі атрад, які непадалёк адпачываў.

Таму, што ранены, дзед Коля ўжо *лініёвым* не стаў. Стаў на працу ў гаспадарчай роце ў Ольштыне, дзе перанеслася яго часць з Седльцаў. Як шмат хто вайну закончыў без вайсковага рангу. Пазней саратнікі ездзілі гадамі на сходы, розныя мерапрыемствы. Коля ўжо не ездзіў, бо страціў слых. Яшчэ толькі ў 50-тую гадавіну заканчэння вайны атрымаў медалі і адзнакі, як кажа — ад Ельцына. Дзіма, якога ўжо два гады на гэтым свеце няма, здолеў яшчэ наведаць сям’ю ў Польшчы. Вось, вольны свет адным прынёс медалі, а іншым рэабілітацыю ды такую ці іншую свабоду.

Коля сёння любіць выцягваць старыя здымкі, медалі, але мне найбольш цікавіла, ці ў арміі пыталіся пра нацыянальнасць.

— Пыталіся, — расказвае дзед,— мы ўсе згэтуль казалі, што мы — беларусы.

Па дзеду Валодзю засталіся нямецкія дакументы з работаў: *Włodzimierz Iwaniuk, Weissrussisch.* Янка Азябла па вайне развіваў на Міхалоўскай зямлі беларускую культуру, а Дзіма Бабкоўскі развіваў у Беларусі сельскую гаспадарку.

А мы, іхнія ўнукі? Мы спяваем... Па-беларуску.

Ляўкова мяняе аблічча

Прыгажэюць вёскі Новае і Старое Ляўкова ў Нараўчанскай гміне. Жыхары гэтых сёлаў абнаўляюць сабе дамы, ставяць новыя платы, малююць агароджы.

Сёлата прыгожа памалявалі крамы нараўчанскай Гміннай спулдзельні ў Новым Ляўкове (тут яе і адрамантавалі) і ў Старым Ляўкове. У Старым Ляўкове ў мінулым пабудавалі 1 550 метраў тратуараў паабапал вуліцы. У ліпені праклалі тратуар ля жылых блокаў, якія стаяць насупраць керамічнай фабрыкі.

Вельмі папрыгажэла сама фабрыка ў Старым Ляўкове. Адмыслова памалявалі тут офісныя будынкі і тыя, у якіх ідзе прадукцыя керамічных будматэрыялаў — пустакоў. Прадпрыемства рыхтуецца да святкавання 40 гадавіны свайго існавання. Урачыстасць запланавана на жнівень.

У ліпені была пачата пракладка тратурара ў Новым Ляўкове. Будзе ён толькі на адным баку вуліцы, але ўсё ж будзе. Тут, у гэтай частцы вёскі, яго ніколі дагэтуль не было. Пры маёй памяці быў брук і далей гравейка, потым усюды быў брук, а цяпер маем асфальтавую маставую. Жыхары-новаляўкоўцы і прыезджыя былі вымушаны хадзіць па маставой, а гэта ж небяспечна. Тут даволі вялікі вулічны рух — гэта рухлівая павятовая дарога ў напрамку фабрыкі, а таксама ў Лешукі, Сушчу, Міхалова і ў Беласток.

(яц)

Несумленны вадзіцель ПКС

Ёсць людзі вельмі прагныя на грошы. А яшчэ некаторыя шукаюць каб падзарабіць, як кажуць, на халяву, нелегальна. Ёсць хцівыя на грошы між іншым сярод вадзіцеляў аўтобусаў ПКС.

З жніўня г.г. у нядзелю ехаў я з Новага Ляўкова ў Беласток. Гайнаўскі аўтобус ПКС выязджае а гадзіне 10.50 і ў Ляўкова прыязджае ў 11.35. Я падаў грошы на ільготны білет у Беласток — 5,75 злотых. Білета не атрымаў. Шафёр (у акулярах) сказаў мне: *Na trasie kogoś podczepię pod pana.*

Я не пагадзіўся на такую здзелку, але вадзіцель не зважаў на мой супраціў. Не ўдалося яму „падчапіць" кагосьці да майго білета ні ў Старым Ляўкове, ні ў Лешуках, ні ў Сушчы, а таксама ў Новай Волі і ў Міхалове. Ехаў я „зайцам" і ўвесь час нерваваўся. І задумаў пра гэта напісаць у „Ніву".

У Беластоку высеў я за г.зв. ронда кругавога руху па алеі Пілсудскага. Калі б ехаў на апошні прыпынак на вакзале ПКС, пайшоў бы да дзяжурнага руху або да дырэктара гэтай фірмы са скаргай на вадзіцеля.

Гэта не першы такі факт. Я пісаў у „Ніву" пра падобныя. Шафёры ПКС павінны быць дысцыплінаваныя. Калі выходзіць, што яны „возяць паветра", тады такія курсы ліквідуюць! Пасажыры не павінны ісці на здзелку з шафёрамі. Ашуканства з іх боку неабходна выкараніць! Яны і так добра зарабляюць. А тут робяць махлярствы, каб падзарабіць „налева". Ім усё мала! І нават прадпрыемства ПКС звядуць да руіны. Падрэзваюць галіну, на якой сядзяць! Губляюць па дарозе добрасумленнасць!

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

Новыя мяшчане

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Крынкі (Сакольскі павет) зноў, а Міхалова (Беластоцкі павет) першы раз будуць гарадамі. Рада міністраў вырашыла, што гэты статус будзе абавязваць ад 1 студзеня будучага года. Войты гмін, у якіх распаложаны гэтыя мясцовасці, цешацца. Частку жыхароў турбуюць сумненні. Незалежна ад гэтага не скрываюць, што больш прэстыжным будзе прызнавацца, што яны гараджане. Крынкі былі горадам ад 1509 года, ад часу надання яму герба каралём Жыгімонтам Старым. Ад таго часу жыхары Крынак маглі звацца мяшчанамі. У 1569 г. Жыгімонт Аўгуст надаў Крынкам гарадскія магдэбургскія правы, якія гарантавалі месту самакіраванне і аўтаномію. Перасталі быць горадам у 1950 годзе. У сваю чаргу Міхалова як самастойная адміністрацыйная адзінка было створана ў 1868 годзе, але ўзнікла яна як Нязбодка ў I палове XVIII ст., а на пачатку XIX ст. стала ўласнасцю Севярына Міхалоўскага, які заснаваў тут першае пасяленне для нямецкіх фабрыкантаў.

Улады Крынак і Міхалова падалі адпаведныя заявы ў Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі на змену статуса ў сакавіку мінулага года, хоць ідэя выспявала значна раней. У абедзвюх гмінах, у рамках грамадскіх кансультацый рэферэндумнага характару рашучая большасць жыхароў, маючых права на галасаванне, выказалася за тое, каб іх мясцовасці былі гарадамі, хоць прыняла ўдзел у галасаванні менш чым чвэрць правамоцных. Гэта м.інш. мела ўплыў на рашэнне Рады міністраў. У абгрунтаванні пералічаны былі таксама іншыя аргументы, прамаўляючыя за „пазітыўным разглядам заяў": прасторава-урбаністычныя, гістарычна-адміністрацыйныя і дэмаграфічныя. Немалое значэнне меў факт, што ў Крынках на 2 667 жыхароў каля 75 прац. займаецца пазасялянскай дзейнасцю, а ў Міхалове адпаведна 87 прац. з 3 330 асоб. У выпадку апошняй мясцовасці не браўся пад увагу гістарычна-адміністрацыйны аргумент. У выпадку абедзвюх мясцовасцей важна было, што „функцыянальна-прасторавыя рысы выразна паказваюць на іх гарадскі характар".

Войты, а ад студзеня бурмістры Міхалова і Крынак лічаць, што ў іх гарадах цэны ўчасткаў і нерухомасцей падскочаць ды што наплывуць інвестыцыі.

Марэк Назарка, войт Міхалоўскай гміны:

— Да гэтай пары мы былі найбольшай вясковай мясцовасцю ў Падляшскім ваяводстве. Атрымаўшы гарадскі статус разлічваем на большы гаспадарчы развой. Горад, хоць бы з-за самога статуса, прыцягвае больш інвестараў, чым вёска. Нашым козырам несумненна з'яўляецца факт, што распаложаны мы толькі 30 кіламетраў ад Беластока.

Войт-бурмістр Назарка ў рамках гарадскіх ужо інвестыцый прадбачвае ўзнікненне крытага басейна і пабудову ратушы:

— З гарадскімі правамі гэта так, як з адукацыяй. Трэба развівацца.

У Міхалове на гмінным інтэрнэтным сайце пасля рашэння Рады міністраў можна было прыняць удзел у апытанні „Ці цешыць цябе тое, што Міхалова будзе горадам". 68 працэнтаў было „за", 12 „супраць", а 20 асоб да гэтага паставіліся абыякава. Аднак аб малым зацікаўленні зменай вясковага статуса можа тут сведчыць факт, што ў апытанні прыняло ўдзел ледзь 25 асоб (хоць колькасць аддадзеных галасоў залежала мабыць ад зацікаўлення гмінным сайтам ці таксама ад доступу да інтэрнэту ў Міхалове). Рашылі мы пазваніць наўдачу да некалькіх жыхароў мясцовасці, набіраючы выпадковыя нумары з тэлефоннай кнігі і пытаючыся, ці гэта добра, што Міхалова будзе горадам. Адказы ў рашучай большасці былі: „Не вельмі".

Пані Юстына дадала з апаскай:

—Усё, мабыць, падаражэе. Можа, узнікне больш адпачынкавых аб'ектаў.

Іаланта Гудалеўская, войт Крынскай гміны, прызналася нам:

— Перш за ўсё вернемся да таго, што было. У людзях застаецца настальгія па тым, што страчана. Рашэнне аб вяртанні гарадскіх правоў таму спалучалася з прагай жыхароў. Гораду лягчэй утрымаць установы, ствараць новыя. Цяжэй, напрыклад, ліквідаваць пастарунак паліцыі. У горадзе таксама большыя шанцы паскарэння інвестыцый і лягчэй выстарацца за еўрасаюзныя сродкі. Сельскагаспадарчыя абшары і так будуць выдзеленыя і апынуцца па-за горадам, таму даплаты для сялян будуць. На жаль, уласнікі сельскагаспадарчых абшараў, якія застануцца ў межах Крынак, гэтыя даплаты страцяць, але гэта невялікі працэнт.

Наўдачу выбраны намі жыхар Крынак пан Станіслаў (мяркуючы па голасе — пажылы мужчына) разважаў:

— Мы былі калісьці горадам, дык было б добра, каб былі ім зноў. Але ці гэта мае сапраўды нейкае значэнне... То ж у Крынках практычна нічога няма.

Ягоны скепсіс сугучны з думкай пісьменніка з Крынак Сакрата Яновіча:

— Я думаю, што Крынкі агорне роспач, асабліва калі будзе гаворка аб аплаце вышэйшых гарадскіх падаткаў. Дык увогуле гэтая справа, мяркую што і для іншых жыхароў таксама, для мяне абыякавая, бо Крынкі і так адміраюць, ператвараюцца ў своеасаблівае надлясніцтва. Крынкі здаўна гэта сялянская вёска без большых амбіцый. Задзіўляючае тое, што хтось хоча з іх зрабіць горад. Міхалова — зразумела. Развіваецца яно і багацее здаўна. Там ёсць крыху прамысловасці.

Мы паразмаўлялі з адной з настаўніц з Міхалова. Баялася яна, ці ў сувязі з новым статусам сваёй мясцовасці не страціць г.зв. вясковага дадатку да зарплаты. Малгажата Паляніс, прэсакратар Падляшскай кураторыі асветы развеяла гэтыя апаскі:

— Згодна з Картай настаўніка дадатак на ўзроўні 10 працэнтаў зарплаты належыць настаўніку занятаму на тэрыторыі вёскі або ў горадзе з лікам да 5 тысяч жыхароў.

Таму вось дадаткі для настаўнікаў у Крынках і Міхалове застануцца, пакуль гэтыя гарады неўзабаве не стануць дынамічна развівацца, а што за гэтым ідзе — не ўзрасце тут лік насельніцтва.

Спыталіся мы таксама ў прафесара Ежы Рэгульскага, аднаго са стваральнікаў тэрытарыяльнага самаўдара ў Польшчы, упаўнаважанага ўрада па справах гэтых рэформ на пачатку дзевяностых гадоў, ці ў сённяшні час (пры трох ступеньках самаўрада і функцыянаванні Польшчы ў ЕС) лепш жыць людзям у вёсцы, ці ў горадзе:

— Папраўдзе няма грунтоўных адрозненняў. Гміны гмінам у Польшчы роўныя. Гэта хутчэй пытанні ў прэстыжным вымярэнні, асабліва для ўлад, значыць, у факце, што войт называецца бурмістрам. Для інвестараў затое лічыцца заплечча, г.зв. абслуга, якая ў прынцыпе ў гарадах лепшая. У сваю чаргу еўрапейскімі праграмамі карыстаюцца як вёскі, так і гарады. Трэба аднак памятаць, што ў доступе да еўрасаюзных сродкаў заадно як гарадоў, так і вёсак могуць быць дзесьці схаваныя бюракратычныя правілы і рашаючыся на змену статуса, трэба прымаць гэта пад увагу.

Да гэтага часу ў Падляшскім ваяводстве дзейнічае 17 паветаў, 13 гарадскіх гмін, 23 вяскова-гарадскія гміны, 82 вясковыя гміны ды 3 тысячы 275 салэцтваў.



Беларус хіліцца да моцнай нацыі!

З Алесем ТАРАНОВІЧАМ, мастаком, літаратарам з Берліна, які сёлета выступіў на „Беларускіх трыялогах", гутарыць Ганна КАНДРАЦЮК

„Ніва": — *На „Трыялогах" ідзе гутарка пра значэнне Падляшша ў Еўропе. Ваш даклад — пад загалоўкам „Беларусы ў эміграцыі". Чаму кранаеце якраз такую праблему?*

Алесь Тарановіч: — Бачыце, узнікае футурыстычнае пытанне: ці заўтра будзе беларускасць? Я апынуўся ў эміграцыі таму, што ведаў адказ на гэтае пытанне.

— Колькі часу Вы ўжо ў эміграцыі?

— У Берліне ўжо дзесяць гадоў.

— Ці многа там беларусаў?

— Я думаю што ў самім Берліне недзе тры тысячы, да гэтага ліку трэба яшчэ дадаць тысячу беларускіх габрэяў. Многія з іх — патрыёты Беларусі.

— Чаму ў вас няма патрэбы аб'яднацца ў беларускую суполку?

— Сапраўды, у Берліне няма беларускіх аб'яднанняў! У свой час я стараўся такое арганізаваць, але пабачыў, што нашы людзі не ідуць на гэта. Прытым у Нямеччыне спрыяюць усякім арганізацыям! Вось людзі з поўдня: туркі, курды, арабы — яны ствараюць свае арганізацыі і лёгка ім гэта ідзе.

— У чым заключаецца наша праблема?

— Беларускі эмігрант адрозніваецца, напрыклад, ад расійскіх эмігрантаў. Яго не кранаюць такія справы як настальгія, пакуты, туга па радзіме. Я лічу, што ў тыповага беларуса няма і не было такога пытання, я маю на ўвазе сённяшніх эмігрантаў і тых хто прыехаў раней. А вось расейцы вельмі пакутуюць. Як ні дзіўна, пакутуюць расейскія немцы. Ну, гэта новы парадокс, у іх нямецкія прозвішчы, мова.

— Тады куды хіляцца беларусы?

— Беларусы хіляцца ў бок немцаў! Гэта вельмі тыповая з'ява.

— Маеце на ўвазе эміграцыю якая падалася за хлебам?

— Я не сказаў бы, што гэтая з'ява датычыць выключна „каўбаснай" эміграцыі. Гэта справа ментальнасці. Беларуская ментальнасць такая, што яна лёгка ўжываецца на чужыне. Я, напрыклад, палітычны ўцякач. Я нарадзіўся і жыў у Беларусі, аднак з'ехаў, бо зразумеў, што там не адбыліся і не адбудуцца ніякія змены. Каб выратаваць свой маральны стан, я быў вымушаны з'ехаць з радзімы. Зараз я адчуваю сябе немцам.

— З чаго гэта бярэцца?

— З таго, што чалавек адчувае вялікую крыўду, што нарадзіўся ў краіне, якая ніколі не магла быць самастойнай. Ні сто гадоў таму, ні дзвесце, ні зараз — калі сам Бог даў такую магчымасць. Калі чалавек бачыць як яго жаданні не маюць шанцу спаўнення, ён пачынае неяк інакш мысліць; пачынаеш думаць — кім мне быць?

— Гаворым пра кастрацыю пачуццяў і сантыментаў, якія даюць сілу ў чужыне. Тады куды звяртаюцца беларусы?

— Да моцнай нацыі. Тым больш, што з немцамі значна лягчэй як з іншымі народамі, прыкладова, французамі. У немцаў вельмі падобны менталітэт. Можа гэта вам паказацца дзіўным, але я добра ведаю немцаў і сам вучуся нямецкага менталітэту.

— Маеце на думцы жыццёвы прагматызм?

— Значна больш: у беларусаў фанатычная цяга да працы. Мы працуем значна больш чым іншыя народы. Ды мы працуем сумленна. Гэта вельмі важна. У Берліне я сустрэўся з многімі народамі і магу сказаць, што не ўсе так як мы адносяцца да працы. Беларусы заўсёды працавалі чэсна, таму так мала ў нас багатых беларусаў-эмігрантаў. Як кажуць: *За труды праведны не построишь палаты каменны!* Мы і немцы любім *труды праведныя* і таму немцы паважаюць беларусаў.

— І могуць „строіць" якія хочаш „палаты каменныя"...

— Тут цывілізаванае грамадства, кожны можа сабе ставіць што хоча.

— Ці першае пакаленне беларусаў адчувае сябе грамадзянамі другой катэгорыі?

— Вось я пішу па-беларуску, размаўляем на руска-нямецкай трасянцы. Яе стварылі расейскія габрэі і паволжскія немцы. Я дам прыклад, я пытаюся ў жонкі: *Ты уже забухала райзу? — Не, яшчэ не замэльдавалася!* Нямецкае слова „бухэн райзэн" — значыць заказаць падарожжа, „мельдунг" таксам значыць „заказаць". Вось, так мы ўвесь час размаўляем...

Ці першае пакаленне эмігрантаў адчувае сябе паўнавартаснымі грамадзянамі? Я скажу за сябе. У эміграцыі я ўжо 10 год. Я лічу што са мной так атрымалася. А вось расійскія немцы, якія жывуць 15 і больш гадоў, нягледзячы на тое, што ведалі з дзяцінства мову, усё роўна думаюць каб вярнуцца ў Расію. Большая частка расійскіх немцаў, іх больш тут за два мільёны, марыць, каб вярнуцца ў Расію. І самі немцы кажуць ім у вочы: якія вы немцы?!

— Паўплывала савецкае выхаванне?

— Сапраўды, савецкае выхаванне зрабіла іх такімі, зараз яны большыя расейцы за саміх расейцаў. Аднак справа тут не ў іх — а ўва мне. Чаму я, уцякач, які моцна быў заангажаваны ў палітычнае жыццё, лічу сябе немцам? Тэарэтычна ў першым пакаленні гэта немагчыма. Дастаеўскі сказаў, што эмігрантам трэба нарадзіцца. Сапраўды, не кожны чалавек можа быць эмігрантам. Я адчуваў, што магу ім быць.

— Вы згадалі пра тысячу беларускіх габрэяў у Берліне.

— У габрэяў шмат сваіх святаў. Я аднойчы пазнаёміўся з жанчынай з Палесся. У 1941 годзе, калі ёй было пяць гадоў, яна апынулася без бацькоў. Усю вайну яна прасядзела ў склепе ў беларускіх сялян. І яна на ўсё жыццё пакінула любоў да гэтых людзей. Стала настаўніцай беларускай мовы. Калі я прыйшоў на габрэйскае свята, я ўбачыў яе ў беларускай кашулі. Яна спявала беларускія песні, гаварыла без акцэнту. Я стаў яе падпытваць. Я быў уражаны, што ў габрэйскім асяроддзі шмат патрыётаў Беларусі. Так што не адзін Шагал быў беларускім патрыётам! Адкуль гэта ідзе — мне цяжка сказаць! Відаць гэта ментальная рыса. І гледзячы на тое, што кожны з іх увесь час думае — ці зменяцца немцы ці не — яны ў параўнанні з расійскімі немцамі жывуць там лёгка.

— Хто такія беларускія эмігранты?

— У асноўным — гэта беларускія дзяўчаты. Нямецкая сям'я страшэнная, яна практычна не існуе. І гэта ўсё робіць новая нямецкая жанчына. Таму зараз немцы бяруць каго пападзе: в'етнамак, кітаек, полек... А беларусак — у першую чаргу.

— Пасля такой экзатычнай дозы крыві генетычны склад немца памяняецца. Гэта выглядае як помста гісторыі?

— Я таксама мяркую, што гэта помста гісторыі. Хоць генетычны склад немца памяняецца не з-за русых і сінявокіх беларусак. У Нямеччыне адбываецца генетычны прагрэс, расце мусульманскае насельніцтва. У арабаў нармалёва восем дзяцей, у немцаў праблема каб выгадаваць адно. Немцы саступаюць ім дарогу, на маіх вачах арабы і туркі займаюць іх дамы, крамы ў цэнтры горада. Гэта сапраўды будзе помста гісторыі! І гэта ўсё робіць новая нямецкая жанчына.

— Жанчына?

— Сучасная нямецкая жанчына гэта жах! У мінулым годзе быў выпадак, калі маці забіла пяць сваіх дзяцей!

— А ў вас жонка?..

— Тыповая беларуска.

— Дзякую за размову!

Гутарыла Ганна КАНДРАЦЮК

Збірайце зёлкі!

Попыт на лекавыя зёлкі і іх сумесі ды прэпараты паказвае, што зараз ахвотна карыстаемся мудрасцю народнай медыцыны. Зёлкі выкарыстоўваем таксама ў фармацэўтычнай, касметычнай і харчовай прамысловасці (у той апошняй м.інш. у мясных і апрацоўчых прадпрыемствах ды ў цукраварнях). Усё больш прымяняюць іх у дамашняй гаспадарцы — як прыправы да страў, адвары да смакавітых напояў.

Цяпер лета ў разгары. Збірайма зёлкі! Гэта занятак вельмі выгадны. У вёсках Гайнаўшчыны працуюць пункты скупкі. Вопытныя збіральнікі маюць магчымасць зарабляць. Дастаткова хацець, мець крыху ведаў пра лекавыя расліны і пра спосабы іх сушэння. Школьная моладзь можа зарабіць на атракцыйныя экскурсіі падчас летніх канікул.

І так, кілаграм сушаных кветак язміну каштуе 20 злотых (столькі колькі і каштанавых кветак ды кветак маргарыткі). Найдаражэйшыя былі раней пялёсткі васілька (валошкі) — 100 зл. за кілаграм. Па 5 злотых можна атрымаць на пункце скупкі за зелле палявых браткаў і трыпутніка, а таксама за лісце сярэбраніка ды карэнне пяцёрніка. Надта выгадна збіраць аер (17 зл.) ды карэнне дзьмухаўца (8,50 зл.) і лісце брусніцы (12 зл.).

Калі збярэм больш зёлак, тады на нашым рынку будзе больш зёлкавых лякарстваў, сумесяў, вітамінізіраваных сіропаў і г.д.

(ян)

Мінулае Баратынца-Рускага

Баратынец-Рускі гэта надбужанская вёскка. У ёй пануе палескі дыялект беларускай мовы. Пачаткі вёскі крыюцца ў сярэднявеччы. На гэтую даўнасць паказвае сама назва Баратынец. Яна паходзіць ад усходнеславянскага імя Борислав — ад яго выводзіцца імя Барыс і іншыя; яно было папулярнае ў IX-XIII стагоддзях.

Подых даўніны адчуваецца таксама ў назве луга Лідзімо, якая выразна яцвяжскага ці літоўскага паходжання. Гэта паказвае на колішняе прабыванне тут балцкіх плямёнаў і іх гаспадарчую дзейнасць. Гэта нейкае адлеглае рэха таго факту, што Баратынец знаходзіўся на колішнім рухлівым шляху, які вёў уздоўж Буга і ў гэтых ваколіцах ён злучаў старажытныя Мельнік з Драгічынам. Прозвішчы жыхароў Баратынца-Рускага красамоўна сведчаць пра даўніну: Айкала, Мамыш, Мантур, Мудэль, Шаўкала.

Тут прыгадваецца старое паданне пра тое, што чорт уночы ўвасабляецца ў барана або ў ката. Гэтыя легенды маюць палескі радавод. У гэтай жа ваколіцы часам знаходзілі на дарозе чорнага барана, які потым аказваўся быць „нячыстай сілай".

Жыхары Баратынца-Рускага вылучаюцца прывязанасцю і замілаваннем да сваёй роднай мясцовасці. У 1915-1972 гадах вёска тры разы згарэла датла, але ніхто па гэтай прычыне яе не пакінуў.

У Баратынцы турыстаў прымаюць з адкрытымі рукамі і гарачымі сэрцамі. Дык варта наведаць гэтую вёску ў Сямятыцкай гміне.

(мох)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Ідэалы ў саломе!

Адна з самых прыгажэйшых песень, якую я пачула ў жыцці — „Олень по бору ходзіт"!

У нас „пад лесам" (у наваколлі Белавежскай пушчы) спявалі яе на вяселлі для маладога. Невыпадкова. Песня апавядае пра момант дарастання, перамену юнака ў мужчыну. Песня пабудаваная на канве ўніверсальнага міфа пра мужчынскую ініцыяцыю. Прыблізныя версіі сустрэнем у Малой Азіі, Грэцыі, Паўночнай Амерыцы.

Наш беларускі варыянт упісаны ў лясны краявід і час (белы камень — час жывых і памерлых). Апякункай абраду, як паўсюдна на свеце бывае, з'яўляецца маці. Яна навучае юнака жыццёвай мудрасці. Паэтыка тэксту паказвае на старажытнае паходжанне песні. Спецыялісты мяркуюць, што можа ёй быць і за тысячу гадоў! І выступае яна практычна на ўсёй этнічнай тэрыторыі беларусаў: ад Беластока — па Магілёў. Я мела яшчэ нагоду пачуць гэтую песню ад прыродных спявачак: Нюсі Пракапюк і Марысі Пашко з хутара між Кутлоўкай, Навінамі і Каменем. Вядома, на вяселлі. Пасля гадоў песня вярнулася да мяне. І гэта дзякуючы маёй улюбёнай настаўніцы Ніне Абрамюк. Спадарыня Ніна падарыла мне запіс са старажытнымі песнямі, якія заспявала ёй Вольга Банькоўская з Навін. Пра гэты запіс можна сказаць адно — гэта паэзія. Ідзе пра белую энергію, якая лунала ад добрага спалучэння тэксту і голасу спявачкі. На жаль, Вольгі Банькоўскай, як і Марысі ды Нюсі, няма ўжо ў жывых. Аднак справу працягвае іх сваячка — спадарыня Кася Ціханюк са Збуча. Пані Кася — лаўрэатка многіх фестываляў і цудоўная асоба. На жаль, яна не дачакалася асобнага запісу на кампакт-дыску. Гэтую прапанову аддаем у рукі маладых, якія належным чынам ацэняць сутнасць таленту...

Падумаеце — навошта кранаем гэтую тэму. Ёсць для гэтага сур'ёзная прычына. Апошнім часам я пабывала на жніўным фестывалі ў Студзіводах. Фестываль праходзіў пад загалоўкам: *Олень по бору ходіт*. На жаль, у час фестывалю мне пашанцавала пачуць толькі адну песню, якая пасавала да загалоўка. Са сцэны, пад раскошнае задавальненне публікі, луналі пікантныя частушкі пра чубатых брыгадзіраў і даярак. Маладыя, вядома, пайшлі ў скокі. Пад іх зграбнымі ножкамі трашчала раскінутая перад сцэнай салома. Арганізатары чамусьці ўсю ідэю спалучылі са жніўным абрадам! Такую падказку дае мелодыя песні, аднак яе вытокі намнога шырэйшыя і глыбейшыя. І мелодыя гэтай песні ў кожнай вёсцы іншая (як і гаворка). Проста, нашы продкі не пераносілі схематычнасці — яна забівае!

У гэты момант мне зрабілася крыўдна за песню „Олень по бору ходзіт". Нельга пад такой шыльдай „малаціць" пяткамі салому! А нецікавая музыка, што паказала апошняе „Басовішча", прадукуе адно агрэсію і дурное задавальненне. Гэта падказка для маладых: не лезьце ў дурныя *тусоўкі*! Бараніце прыгожых песень і таленавітых людзей! Інакш — нас няма і не будзе! Мне падабаецца ваш энтузіязм.

ЗОРКА
Фота Ганны КАНДРАЦЮК

PS. Сёння друкуем паўнейшы (лагічны) тэкст песні, які запісаў Мікола Гайдук у Кнаразах. Сюжэт запісаны на гаворцы з Ласінскай парафіі. Нотаў не друкуем прынцыпова, бо, як ужо мы сказалі, у кожнай вёсцы гэтую песню спявалі крышку інакш...

Олень по бору ходзіт

Олень по бору ходзіт (2)
За ім Ясь коня водзіт
Стрыльбоньку набівае (2)
В оленя поцэляе
Нэ попаў вуон в оленя (2)
А в білого камэня
І схілів головоньку (2)
Конёві на грывоньку
Везі мэнэ коніку (2)
До моейі матулі
Ой матулю (2)
Чом я долі нэ маю
Чом я долі нэ маю (2)
В камэня поцэляю
Нэ бэры сынку вдовонькі (2)
Бо нэ будэш міець долі
А бэры сынку дівоньку (2)
Будэш міеці доленьку
Бо вдовіное сэрцэ (2)
Як осэньное сонцэ
Воно хоць злоцютэньке (2)
Але всё холоднэньке
А дзівочое сэрцэ (2)
Як вэсновое сонцэ
Воно хоць хмурнюсеньке (2)
Але всё тэплюсеньке

Вершы Віктара Шведа

Штучныя зубы

— Баляць, доктар любы,
Мае штучныя зубы,
Якія ласкава
Мне доктар уставіў.

— А я ж, без рэкламы,
Сказаў вам прама,
Што яны, без цудаў,
Як сапраўдныя будуць.

Сустрэча пісьменнікаў

— Пяцігадовы мой сынок
Страшэнны мне зрабіў
сюрпрыз,
Знішчыў майго труда
гадок –
Аповесці машынапіс.

— Па страце важнае
такой
Хачу цябе, браток, спытаць:
— Сынок пяцігадовы твой
Умее сапраўды чытаць?

Фота Ганны Кандрацок

„Ільінская пятніца" і „Жэмэрва"

ГІСТОРЫЯ АБ ТЫМ, ЯК ПРАВІЛЬНА ТРЭБА АПУСКАЦЦА Ў АЗЁРНУЮ РОЎНЯДЗЬ

Заўтра, заўтра збудзецца трапяткая, даўнюткая мара Тодара: мілая дзяўчынка Тэрэзка згадзілася з'ездзіць з ім пакупацца на возера. Недалёкае і неглыбокае, яно мела летам надзвычай цёплую ваду і прыхоўвала нейкую невыказную таямніцу. „Ты адчуеш яе", — адкажа юнак дзяўчыне, калі тая спытаецца пра сакрэт.

І яны прыедуць туды; сонца ўжо будзе крыху апускацца за блізкі пагорак, а ў вадзе будуць адбівацца жоўта-белыя прыбярэжныя рамонкі. Амаль такія ж рамонкі заўважыць Тодар на купальнічку Тэрэзкі; але не паспее ёй нічога сказаць, як дзяўчына хутка, імкліва ўвойдзе ў азёрную роўнядзь.

„Я не адчула там ніякай таямніцы", — скажа крыху расчаравана, калі, выйшаўшы, пырсне на яго вечарова-азёрнымі кроплямі.

„І не адчуеш", — з лёгкім адценнем суму ўсміхнецца ў адказ юнак.

„Чаму?"

„Чаму? А ты паспрабуй зайсці ў ваду не так, як зайшла, а так ціха, як апускаецца гэтае сонца за далягляд", — пачуе Тэрэзка.

І памарудзіць хвіліну, і зноў дзявочыя босыя ногі адчуюць жоўты пясочак, што будзе рабіцца ўсё больш вільготным, вільготным...

І пяшчотным кацяняткам лізне хваля шчыкалаткі: „Сакавітай, духмянай травой пахнуць ногі твае, ад пятак да самых сцёгнаў".

Сарамліва пацалуе вада кругленькія дзявочыя каленкі: „Сонца і месяц не цалавалі цябе так нават у маленстве, як хачу цалаваць цябе я".

І ў гэтую хвілю сапраўдны месяц пакажацца над лесам, і мякка казытне акуратную ямачку пасярод жоўта-белых рамонкаў: „Немагчыма адарваць вачэй ад нябачных слядоў, якія пакідаеш ты сярод гэтай вады, сярод гэтай травы, сярод гэтага духмяна-п'янкога, ліпеньскага квітнення".

А ветрык ускудзерыць залацістыя валасы, перабяжыць гарэзна з доўгай прыгожай шыі крыху ніжэй, заблукае паміж сакавітых, крэпенькіх грудзей-яблычкаў, абдыме за плечы, а потым — дыхне горача ў маленькае вушка: „Калі і ёсць на свеце такое сэрца, дзе табе бясконца ўтульна, хораша і надзейна, — дык ты ведаеш, дзе і чыё яно, тое сэрца".

І выйдзе Тэрэзка з вады, апусціцца на пясок побач з Тодарам, і зачаравана скажа яму, проста гледзячы ў вочы: „У гэтага возера — твой голас, твой шэпт, твае словы, мілы мой Тодзік..."

„І яшчэ — мае рукі", — адкажа, падхопіць лёгкае дзявочае цела; і апусціцца ў азёрную роўнядзь яны ўжо разам, каб разам ужо ўведаць тую самую — невыказную таямніцу.

Ваш Дзядзечка СІД

26 чэрвеня 2008 г., Кобрын

Музыка з кайфам

Хто забойца HASTA LA FILLSTA?

У музыцы бывае, што нехта хоча забіць памяць пра гурты, бывае аднак часта наадварот, — спробы забойства памяці канчаюцца народзінамі легенды!

Гурту *Hasta la Fillsta* па шчырасці ніхто не забіваў, проста, вакалістка з'ехала за мяжу і дарогі музыкаў разышліся. Але ў нейкім сэнсе пра забойцаў можна тут сказаць, у перакладзе з іспанскай мовы — *Hasta la Fillsta* гэта забойцы колеру, а пра сам гурт, карыстаючыся фільмавымі асацыяцыямі, можна сказаць „музычныя тэрмінатары". Не існавалі нават года, калі ў 1996 годзе прыехалі на фестываль „Басовішча" і зразу ўзялі першую ўзнагароду. Хаця гурт пратрываў да 1999 года, застаўся сапраўднай легендай. Мне заўсёды асацыяваўся з вялікім уздымам беларускай музыкі ў 90-тых гадах. Не павінна гэта здзіўляць, калі глянем на музыкаў, якія стварылі гурт у яго пачатках. Побач вакалісткі Крысціны Мендзялеевай, на гітары іграў Сяргей Кананові, сёння музыка гуртоў *Крамбамбуля*, *Зэт*, *Pomidor/OFF*, Косця Калеснікаў, вядомы хаця б як бас-гітарыст гурту *IQ 48* ці Дзіма Харытановіч, зараз бубнач *Pomidor/OFF*. Думаю, шмат прозвішчаў, якія пацвярджаюць музычную якасць гэтага праекта. А музыка даволі цікавая, мне заўсёды здавалася, што яна пераносіць кудысьці далёка, — можна лёгка пры ёй плаваць у хмарах і ў марах.

Але цікавая справа ўвогуле: адкуль ідэя, каб прыпомніць гэты гурт? Па-першае, у 2005 годзе з'явіўся сайт гурту, на якім можна між іншым знайсці запісы музыкі, можна знайсці інтэрв'ю і артыкулы, можна і глянуць на тэксты. З другога боку — інспірацыяй да гэтага ўспаміну стаў таксама новы праект заснаваны перадусім Памідорам і Сяргеем Кананові, які прэзентаваўся на сёлетнім „Басовішчы". Праект называецца „Hasta"! Не здзіўляе вас падабенства ў назве, у асобах заснавальнікаў? Мяне — так, але таксама і значэнне слова *Hasta*, якое прывяла я раней, можа варажыць цікавую з'яву ў беларускай музыцы. Няхай будзе яна паспяховай, бо вакальны дуэт Памідора з Сашкам Ракаўцом (*IQ 48*) гэта заўсёды штосьці свежае і чаканае.

Сяргей Кананові, гітарыст Hasta La Fillsta

i_basovka@o2.pl

Міра ЛУКША

Канюкі з Канюкоў

У канюка звычайнага —
Голас адчайны.
Хоць драпежны,
Увішны-ўежны,
Усё кленчыць,
Усё енчыць,
Быццам просіць —
Няма досыць
Тут спажывы?
Канюк жа птах нелянівы!
Як падымецца на крылах,
Паглядзець на яго міла,
Для таго карцінка люба,
Каму яго нястрашна дзюба,
У кручок круты сагнёна!
Бо канюк жа ж — не варона.
Чуюць у вёсцы: „Кія-кія!"
А „Кіі-й!" дзе? Каму тут кія?

Канюкі, курэй хавайце!
Гусянятак зачыняйце!
Бо канюк і канючыха
У Канюках наробяць ліха,
Бо ж сваіх канючанятак
Пакарміць схочуць багата,
Адны ж мышкі — малавата
У меню для птушанятак.
Ой, ты канючыха-каня,
Не будзі нас плачам зрання.
Усе ж просяць есці дзеткі.
На канюкаўскіх палетках
Не енч зранку, не канюч!
Дзюбу зачыні на ключ!

Польска-беларуская крыжаванка № 31

Польска-беларуская крыжаванка н-р 33

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 29:

Яда, ворс, пах, марафон, парасон, засада, муха, боб, паўлін, до, гарт, лад, чарапаха. Ягня, крупа. Харч, рап, аўта, выраз, арабіна, фасон, спосаб, анод, дах, ах!, нагода.



Каб захаваць ад забыцця

Размова з Іааннай Корх, гісторыкам Комплексу прафесійных школ з Гайнаўкі, карэспандэнткай „Беларускіх гістарычных сшыткаў".

— Вы апошнім часам даследуеце эпідэміі, што ў мінулым у сотнях і тысячах асоб забівалі наша насельніцтва, пражываючае на тэрыторыі сённяшняй Гайнаўшчыны і Бельшчыны. Што было штуршком, каб заняцца гэтай тэмай?

— Здаўна я цікавілася складанай для даследавання дэмаграфіяй нашых тэрыторый у больш аддаленым мінулым, а эпідэміі мелі вялікае ўздзеянне на дэмаграфічныя змены. Вясной гэтага года я са сваімі вучнямі пачала на практыцы рэалізаваць праект „Халерычныя могілкі Гайнаўскага павета", што ладзіцца пад патранажам Аб'яднання спадчыны Падляшша з Пухлаў. Падрыхтоўка да канкрэтных дзеянняў пачалася ўжо восенню мінулага года і я тады рашылася больш дакладна даследаваць эпідэміі, што забівалі людзей на нашых тэрыторыях, каб пасля магчы выкарыстаць свае веды на практыцы, наведваючы нашы могілкі. Каб здабыць інфармацыю, працавала я ў Дзяржаўным архіве ў Беластоку, карысталася матэрыяламі, якія асталіся яшчэ ў нашых праваслаўных прыходах, а пасля ўжо разам з моладдзю праводзіла размовы са старэйшымі людзьмі, якія памятаюць расказы пра эпідэміі і могілкі, на якіх у супольных магілах хавалі пацярпеўшых ад іх людзей.

— Якія месцы ўдалося вам адшукаць, што сведчаць пра існаванне там могілак, на якіх хавалі людзей у час эпідэмій?

— Могілкі, што ўзнікалі ў час эпідэмій шукала я сама і дапамаглі мне вучні, што жывуць на Гайнаўшчыне або маюць там сямейнікаў. Знайшлі мы халерычныя могілкі распаложаныя побач Дубіч-Асочных, Старога Беразова, Сямівалокаў, што з'яўляецца хутарам Пасечнікаў і побач Чыжоў. Акрэслілі мы месцы, дзе знаходзіліся гэтыя могілкі, рабілі планы іх размяшчэння, а прынамсі распалажэння камення на іх. Абфатаграфавалі могілкі і паразмаўлялі з мясцовымі людзьмі пра аповеды, якія пераказваюцца з пакалення ў пакаленне ў гэтых сёлах наконт халерычных могілак. Наша работа яшчэ не закончана, бо ёсць у нас інфармацыі і пра іншыя халерычныя могілкі на Гайнаўшчыне, хаця б у наваколлі Новага Беразова і паміж Шастаковам і Асоўкай. Ёсць таксама аповеды пра халерычныя могілкі, распаложаныя паміж Грабаўцом і Чахамі, а месца гэтае называюць „Пад чорным крыжам", але няма ўжо там ні крыжа, ні слядоў па гэтых могілках. З пачаткам новага школьнага года будзем аналізаваць сабраны матэрыял і ў рамках праекта прадбачваем ушанаваць памяць пахаваных на халерычных могілках людзей. У паразуменні з мясцовымі самаўрадамі, святарамі і насельніцтвам хочам паставіць на гэтых могілках крыжы і дошкі з інфармацыяй пра пахаваных там людзей, памерлых у час эпідэмій. Разлічваем на асаблівую дапамогу мясцовых самаўрадаў. Гэта вялікі праект, а перад намі яшчэ многа работы, бо прадбачваем выдаць публікацыю з фатаграфіямі, картамі і апісаннямі халерычных могілак. Хочам таксама заахвоціць мясцовае насельніцтва і свяшчэннікаў, каб прынамсі раз у год прыходзілі туды памаліцца за душы памерлых, якіх часта закопвалі ў супольныя магілы без прысутнасці святароў, а бывала, што нават у хатах не было асвячонай вады, якой у час паховінаў крапілі магілы. Калі будзе такая магчымасць, паспрабуем акрэсліць тэрыторыю даследаваных намі халерычных могілак, хаця на іх не дазваляецца весці раскопак. Вірус халеры ў спрыяльных умовах, калі будзе пераходзіць з аднаго карміцеля на другога, можа пражыць нават сотні гадоў, але гэта можа тычыцца толькі месцаў глыбока размешчаных пад паверхняй, а ў час эпідэмій глыбока закопвалі людзей, на 2-3 метры ўглыб. На палях побач гэтых могілак, дзе людзі ў час арання знаходзяць косці, віруса халеры ўжо няма.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

— Хіба жыхары Дубіч-Асочных найбольш задбалі пра сваіх продкаў, бо на месцы халерычных могілак паставілі часоўню, у якой разам са святаром з Новага Беразова моляцца штогод і нават у сваім сяле сталі святкаваць у гэты дзень.

— Жыхары Дубіч-Асочных самі задбалі пра могілкі. За свае сродкі і сваімі сіламі пабудавалі каплічку і паставілі крыж. Знаходзіцца там таксама даўні камень з выбітым на ім крыжам і кружком, што сведчыць аб супольнай магіле, але можна там убачыць больш вялікі камень. Можа было там нават дзесяць ці дваццаць супольных магілаў, дзе хавалі таксама жыхароў навакольных сёл. Людзі з Дубіч на падставе даўніх пераказаў пацвярджаюць, што былі гэта менавіта халерычныя могілкі, а з маіх даследаванняў вынікае, што былі гэта халерычныя могілкі з 1831 года, калі расійскае войска ліквідавала Лістападаўскае паўстанне. У Бельску знаходзіліся тады расійскія войскі, а праз нашы тэрыторыі праходзілі таксама польскія паўстанцы. Халеру хутчэй за ўсё прынеслі жаўнеры або паўстанцы, якія сюды прыйшлі. Мяркуецца, што непадалёк ад тэрыторыі сённяшняй Гайнаўкі было змаганне паўстанцаў з расійскімі войскамі і лічыцца, што ў межах сённяшняй Гайнаўкі былі таксама халерычныя могілкі.

— Іншыя халерычныя могілкі, якія вы даследавалі, хіба ўжо менш задбаныя?

— Побач Старога Беразова на могілках стаіць драўляны крыж. Ляжыць на могілках таксама цэментавы крыж, якога людзі не падымаюць. Каменне на гэтых могілках можа сведчыць, што ў гэтых месцах былі супольныя магілы або паводле гэтых камянёў можна зрабіць абрыс могілак.

— Можа аднак каля Старога Беразова знаходзяцца не халерычныя могілкі, а месца, дзе закопвалі людзей пасля іншых эпідэмій?

— Эпідэмія халеры паявілася ў XIX стагоддзі і праўдападобна ў гэтым часе хавалі людзей на могільніку побач Старога Беразова. Раней найчасцейшай эпідэміяй на нашых тэрыторыях была чума.

— Які могільнік можа быць каля Сямівалок?

— Калі гаварыць пра Сямівалокі, дык людзі з гэтага хутара самі пацвярджаюць, што былі там халерычныя могілкі. Мясцовыя жыхары расказвалі, што спачатку хацелі везці памерлых на могілкі прыхода ў Старым Корніне, але жыхары гэтага сяла заблакіравалі дарогу і не дазволілі везці пад сваю вёску людзей памерлых у Сямівалоках у час эпідэміі. Месца на якім знаходзяцца могілкі мясцовыя людзі называюць Маркавым полем, паколькі чалавек з Сямівалокаў, які называўся Марк, перадаў участак свайго поля пад паховіны людзей памерлых у час эпідэміі.

— Вы ўспаміналі таксама пра могілкі распаложаныя побач Чыжоў.

— Мы зрабілі толькі фатаграфіі гэтых могілак. Будзем яшчэ даследаваць іх пасля канікулаў. Могілкі, што ўзніклі ў час эпідэміі, знаходзяцца таксама побач Вітава, імі мы яшчэ і не займаліся. Аднак на крыжы, што стаіць на гэтым могільніку, адчытала я, што быў ён з XVIII стагоддзя, магчыма, што з перыяду Паўночнай вайны, з 1708 года. У маёй роднай вёсцы Вітаве называюць іх паганскімі могілкамі, бо знаходзілі на іх таксама гаршкі з прахам ад спаленых цел. Можа на даўніх паганскіх могілках пачалі хаваць людзей у час эпідэміі.

— Ці сярод мясцовага насельніцтва захаваліся больш дакладныя аповеды наконт эпідэмій і дзеянняў жыхароў сёл у далёкім мінулым, каб спыніць смерць блізкіх асоб?

— Захаваліся цікавыя аповеды наконт паводзін людзей, якія стараліся рознымі спосабамі зберагчы сваё сяло перад эпідэміяй і астацца ў жывых.

— Ці нашы людзі перадусім не ішлі маліцца ў цэрквы, каб прасіць у Бога памілавання і збаўлення ад эпідэмій?

— Нашы людзі верылі, што эпідэміі ёсць пакараннем за іх грахі і канешне маліліся да Бога і нават не слухаліся ўказанняў тагачасных улад, каб не збірацца ў адным месцы і яшчэ больш масава, чым раней, ішлі маліцца ў царкву. Тады ў прытворах акурвалі іх нейкім растворам з хлору, каб пазбегнуць пашырэння эпідэміі.

— У час розных эпідэмій людзі ставілі ў сваіх сёлах крыжы.

— Апрача малітвы жыхары вёсак, якія кранула эпідэмія, стараліся паводзіць сябе таксама згодна з падказкамі старэйшых людзей. Мужчыны за ноч стараліся зрабіць крыж, найчасцей з дуба, а жанчыны мелі за ноч выткаць ручнік і з ім абысці тры разы сваю вёску, а пасля завязаць яго на ўкапаным у зямлю крыжы. Уся гэтая работа адбывалася з малітвай і была матэрыяльнай ахвярай людзей. Паводле аповедаў старэйшых людзей, пасля такіх дзеянняў і малітваў эпідэмія слабела. Аднак захаваліся розныя аповеды пра крыжы і ручнікі, што ахоўвалі сёлы ад заразы. Напрыклад, у Вілюках спачатку ручнік асвячалі ў царкве, а пасля закопвалі яго пад крыжам. Крыжы жыхары нашых сёл ставілі таксама ў час іншых няшчасцяў. Маглі таксама хадзіць вакол вёсак з малітвамі і іконамі, як рабілі пазней, у час розных бедаў.

(заканчэнне размовы будзе)

Гутарыў Аляксей МАРОЗ

Доля і няволя бацькоў

Ніна БРУЧКО

Серафім Гарбачук

Сонца стаяла ў поўдзень, моцна прыпякала, нат куры і коцікі схаваліся пад густыя кусты. А мне заманілася раптам праехацца веласіпедам па асфальтавай вуліцы Цялушак, каб загарэць крышку пад гарачым вецярком і палюбавацца красой вёскі. Хаця ў вёсцы мала людзей, да таго самыя старэйшыя, а ўсё-такі хаты прыгажэюць: дзе-нідзе перабудоўкі, новыя шалёўкі, пластмасавыя вокны і абавязкова лазенькі. А панадворкі кіпяць у несустраканых даўней сартах кветак ці модных цяпер дрэвах, а там і сям убачыш і воднае вочка. Як быццам бы не твая вёска! Зусім памірае характар даўняй „свойскай вёскі". І толькі нам, старэйшым, сумна робіцца на душы. Маладыя, нашы дзеці, унучкі, гэта ж не яны майстры новай вёскі, цешацца — адны едуць памагаць бацькам, іншыя аддыхнуцца ад гаманлівага горада. Многія, зусім чужыя — проста купілі апусцелыя домікі, пабудавалі па-гарадскому і таксама прыязджаюць цешыцца рэчкай, лесам, бусламі...

Суседка Ніна з сястрой Манькай амаль як штодня адпачываюць на лавачцы за хатай, у цянёчку. Жанчыны ўжо немаладыя, у поле не ідуць. Ды якія бабы ходзяць цяперака ў поле? Хіба што вясной палоць агарод ці трускалкі! Усе амаль пенсіянеры, *рэнцістыя*, як сябе завуць. А ў полі машыны ды амаль адны мужчыны. Калі хто перадаў гаспадарку дзецям, як мае суседзі, у кожную суботу прыязджаюць яны з горада, каб памагчы ў важнейшых працах такіх як жніво, капанне ці іншых цяжэйшых занятках.

Уязджаючы на свой падворак пачула я голас Нінкі:

— Хадзі, суседачка, пасядзіш з намі, пабалакаем, весялей будзе ўтрая!

З ахвотай, пакінуўшы веласіпед, далучылася я да суседак. У тую хвіліну прысеў на лавачку і Нінчын муж, Коля Васілюк.

— Вялікі ў вас панадворак, паабапал вуліцы і вельмі многа будынкаў, — азвалася я. — Ты, Коля, здаецца, прыступа? Хто іх столькі наставіў, цесць, ці ты? А хату хто будаваў?

— Куды там! — умяшалася Нінка. — Я ўжо не раз лаяла мужа: „Хопіць гэтых шпіхерчыкаў!" Ды нічога не памагло: яшчэ летась за вуліцай адзін паставіў!

— Бо я люблю парадак, не магу сцярпець, калі штосьці валяецца і мокне на панадворку, — бараніўся Коля. — А хату паставіў яшчэ цесцеў бацька, значыць, Нінчын дзед.

— А хто ў вас камандаваў гаспадаркай, цесць ці зяць-прыступа?

— І я, і цесць — абое. Мой цесць, Серафім Гарбачук, быў разумным чалавекам, згодлівым. Нямала ў жыцці блукаўся па свеце і шмат чаго ўбачыў ды перажыў, — адказаў Коля.

— Ой, многа гора ў жыцці дасведчыў мой баценька! — падхапіла Нінка. — Нарадзіўся і жыў у Цялушках, на гэтым жа месцы, дзе мы цяпер сядзім. З бежанства вярнуўся толькі з сястрой. Бацькі памерлі, як многія тады, у дарозе. Яму тады было толькі 17 гадоў. І хаця ўсюды расла толькі крапіва, то на іх шчасце хатка цэлая стаяла, а нямногія ў вёсцы асталіся. Трэба было неўзабаве жаніцца і нанова гаспадарыць па паўучастку зямлі. Пасватаў тады Ольгу Лук'янюк, таксама маладзенькую целушэцкую дзяўчыну, а сястру замуж выдаў. Так вось неўзабаве і мы з Манькай прыйшлі на свет. Быў яшчэ ў нас брацік, ды памёр, наймалодшы, такі прыгожанькі, дасціпны быў, хоць мала яго помню...

На момант спынілася, задумалася Нінка.

— Многа гадоў прыйшлося нам быць без бацькі, — уключылася ў размову яе сястра, Марыя Васілюк. — Я хаця і старэйшая, якасьці слаба што помню. Толькі асталося ў галаве, як тата вярнуліся дамоў з аэрадрома, куды забралі яго на работу. Помню, меў на сабе белую вопратку і выглядаў як млынар. Увайшоў на панадворак, а я яго не пазнала, невялікая яшчэ была. Спужалася і чым хутчэй пабегла да маці на агарод, крычаўшы: „Мамо, хіба татко вярнуліся!" Ды як папаў ён у Нямеччыну і да Саветаў, не ведаю, слабую маю памяць ужо. А калі бацька вярнуўся з Саюза, мне было ўжо 17 гадоў, а Нінцы 12. Яна і дагадоўвала бацькоў, не я, таму і больш усяго помніць. Мяне аддалі замуж за Колевага малодшага брата Васіля, які нядаўна што памёр, і я асталася цяпер адна. Праўда, дзеці ў горадзе і ўнукі ёсць. Па смерці мужа мяне на пакінулі, зімавала ў горадзе, а летам хочацца быць у сваёй, як кажуць, роднай хатцы, на вёсцы. Дзеці і ўнукі амаль штодзень мне звоняць і часта наведваюць сваю хворую бабулю.

— Гэта праўда, я гадавала, ды была маладая, запрацаваная і не вельмі прыслухоўвалася ўспамінам бацькі, — падтакнула сястра Нінка.

— Я таксама коратка ў жыцці пацешыўся бацькам, — увайшоў у размову жонкі і брацікі Коля. — Сіратой астаўся маючы 12 гадоў і вайну добра памятаю. Па-дзіцячы яе перажываў. Калі немцы адступалі, сагналі жыхароў нашай вёскі, каму не ўдалося схавацца, і гналі ў Канюкі, а потым у Рыбалы. Знайшоўся і я сярод іх. Немцы адступалі, ішлі ззаду натоўпы людзей і паганялі ўсіх, хто адступаў. Я ўсё памятаю. Па дарозе некаторым удалося шмыгануць у высокае жыта, як хоць бы дзесяцігадоваму Жэніку, майму суседу са старэйшай цёткай, другім — паціхеньку спратацца на панадворках у Канюках. Памятаю цяжарную целушэцкую жанчыну, якая ад стомы на хвіліну прысела. Падышоў тады немец, піхануў яе наском чобата і злосна крыкнуў: „Вег! Вег!". Загналі нас у Рыбалы, аддзялілі жанчын, дзяцей і старэчаў, а маладых мужчын пагналі ў Трычоўку. Нас пусцілі дамоў. Майго бацьку Уладзіміра Васілюка прызначылі немцы разам у іншымі аднавяскоўцамі гнаць кароў і авечак у Трычоўку, на зарэз. На паваротную дарогу далі ім пропускі. Вяртаючыся, наткнуліся яны на нямецкую аблаву ля паўлаўскага лесу. Пропускі адзін з немцаў парваў, а мужчын пагналі назад у Трычоўку. Там сагналі адных у клуню, іншых, казалі, у хату, якую падпалілі і жывымі людзей спалілі. Тут закончыў жыццё і мой бацька і яшчэ адзін мужык з Цялушак. Асіраціў ён пяцёра малых сынкоў. Як жа ж мы патрабавалі ў жыцці бацькі, нават будучы дарослымі! Самі вымушаны былі сабе радзіць і шукаць прыстанішча ў жыцці, — працягваў Коля.

— Наш бацька меў больш шчасця, астаўся тады жывым. Потым успамінаў крыкі, якія даходзілі з ахопленага полымем будынка, — дадала Нінка.

— Калі нас так гналі ў Рыбалы, — працягваў далей Коля, — па дарозе далучылі схопленых людзей з іншых вёсак на шляху, тых, хто не паспеў уцячы.

— Відаць так папаўся бацька майго сябра Пеці Паўлючука з Паўлаў. І ён кончыўся ў пажары ў Трычоўцы, пакінуўшы дома маладую жонку з малым сынам, — прыпомнілася мне.

— Косці родных сем'і пазбіралі і перанеслі ў супольную магілу на паўлаўскія могілкі, паставілі помнік, выпісалі прозвішчы загінулых. Ездзім і мы ў памінальныя дні памаліцца за іх душы. Быў я таксама на месцы пакуты ў Трычоўцы, пабачыў помнік ды памаліўся і ў роздумах стараўся уявіць сабе страшны вобраз трагедыі, вялікія мукі майго таты і іншых, — праз сілу, сцішаным голасам кончыў успамін пра свайго бацьку Коля.

— Нашага бацьку Серафіма і іншых, каго пакінулі ў жывых, пагналі за сабою на фронт, капаць акопы. І такім спосабам трапіў ён у Нямеччыну. Хоць бацька называў лагер, дзе ён апынуўся, я не запамятала. Вызвалілі іх амерыканцы. Потым рускія аддзялілі палякаў ад рускіх і тых другіх вывезлі ў Савецкі Саюз. Бацька наш, відаць, назваў сябе „рускім" і такім чынам трапіў за граніцу. У канцы апынуўся ў шахтах Данбаса. Цяжка працаваў і цярпеў голад. Разам з ім быў нейкі час сестрынец, які там ажаніўся і астаўся. Голад прымушаў іх хадзіць папрашайнічаць, ды што маглі яны выжабраваць, калі людзі нічога сабе не мелі? Тады куплялі зерне і самі малолі муку ў жорнах і варылі супы. Бацька прыслаў пісьмо з Данбаса і мы ўжо ведалі, што ён жывы. Давала гэта сілу і надзею маме, якая сама з малымі дзяўчаткамі гаспадарыла.

Аднойчы, як потым расказваў баценька, атрымаў ён пропуск на некалькі дзён з загадам вярнуцца тады і тады ў шахту. Перад гэтым мама напісала бацьку і дала адрас нашых сваякоў у Гродне, якія выехалі з Польшчы зараз жа пасля вайны. Туды і паехаў наш тата. Цётка мела трох адукаваных сыноў, якія займалі ў Беларусі высокія пасады. Яны і пастараліся пакінуць нашага бацьку ў Гродне. Стаў ён працаваць там на віназаводзе. Жыццё палягчэла, а мама ўвесь час слала гродзенскім уладам просьбы на дазвол вяртання мужа на радзіму. І так у 1951 годзе, у сенакос, татка вярнуўся дамоў. Хворы, схуднелы, з катарам страўніка і болямі сэрца. Не мог амаль нічога есці — ні малака, ні мясных супоў. Які з яго мог быць гаспадар! Важнейшым было, што вярнуўся жывым. Як мы цешыліся! Я не памятаю прывітання, ды мама потым расказвала: „Прыйшоў у хату сусед і сказаў: «Олько, ідзі ў царкву, падай запіску за здароўе, падзякуй Богу». Так і зрабіла. Баценька доўга слабаваў. Прыйшлося мне, тады маладзенькай, цяжка працаваць. Калі мае сяброўкі гулялі ў мячык на вуліцы, я займалася гаспадаркай.

Палёгка наступіла, калі прыступіў да мяне Коля, — працягвала Нінка. — І хаця здароўе таты палепшала, мог есці нават капусту, то ўсё-такі сілы ападалі, адзывалася цяжкае пражытае. Калі перастаў тата хадзіць у поле, разам з мамай гадавалі ўнукаў, нашых дзяцей, і маіх, і Маньчыных. Памятаю, любіў тата і ўмеў рабіць лекавыя наліўкі з чорнага бэзу. Яшчэ пасля яго смерці давала я суседцы татавы наліўкі на лячэнне прастуды ў яе ўнукаў.

Я, як наследніца на гаспадарцы, дагадоўвала абое бацькоў. Мама на шэсць гадоў перажыла бацьку, памерла ў 88 гадоў. Тата ўмёр у капанне картоплі ў 1989 годзе, скончыўшы 82 гады. Пад канец жыцця трохі паляжаў — ногі не хадзілі, ды памяць меў добрую. Коратка перад смерцю прасіў мяне: „Ніна, калі прыйдзеш з поля, убяжы ў хату хоць на мінутку, так хочацца пагаварыць з табою". Напамінаў: „Не працуй так цяжка, здароўе важнейшае ад усяго, я стары, а жыць яшчэ хацелася б!". А я адказала: „Тату, узаўтра дакапаем, многа часу будзем мець на размову". Аднак, не паспелі нагаварыцца. Баценька адышоў. Мо, хацеў мне сказаць штосьці важнае? І дагэтуль мучыць мяне думка: чаму мы так мала гутарылі адно з адным, усё важнейшая праца ды праца, а жыццё кароткае, хутка прабягае, і немагчыма нічому вярнуцца, — выцерла слёзы Ніна. — Добрых бацькоў мы мелі, вельмі добрых. А сняцца яны мне вельмі рэдка. Год часу ад смерці было прайшло, а тата мне ні разу не прысніўся. На *ракавой* абедні бацюшка спытаўся ў мяне: „Скажы, Ніна, прыходзіць ваш папа ў сне?" А я так сказала з горыччу: „Не, бацюшка, ні разу не прысніўся мой даражэнькі тата, мо я заслаба яго даглядала?". А бацюшка на гэта: „Не, дарагая, значыць, добрая ты дачка была і яго душа нічога, апрача малітвы, ад цябе не патрабуе". А цяпер бацькі сняцца мне вельмі рэдка, хаця часта з сястрой успамінаем супольнае прошлае — і радасці, і беды, як то ў кожным жыцці бывае...

Серафім Гарбачук сярод сяброў з гродзенскага віназавода (стаіць другі злева)

Расспяваная „Бандароўская гасцёўня”

Тэкст і фота Віктара БУРЫ

У жыцці чалавека і грамадства песня заўсёды займала пачэснае месца. І нездарма песню, якая не дазваляе маўчаць душы, называюць скарбонкай духовага жыцця.

На невялікай прасторы маляўнічага куточка нашай малой айчыны, з аднаго боку атуленай плацінай Семяноўскага вадасховішча, з другой — сасновым лесам, з трэцяй — палеткамі са збажыной і духмянымі кветкамі, сабраліся жыхары бандарскіх блокаў. Яны — перасяленцы з вёсак Гарбары, Рудня, Боўтрыкі, Лука, сядзібы якіх апынуліся на дне штучнага вадаёма. І хаця ў іх душах тоіцца жаль па страчаным, ахвотна прыходзяць на фэст паслухаць свае родныя песні. І так было 19 ліпеня, калі чарговы, ужо восьмы, раз адбылася „Бандароўская гасцёўня”, ладжаная беларускімі дзеячамі салэцтва Бандары Міхалоўскай гміны, пры выдатнай дапамозе гміннай раднай Ніны Лукшы і солтыскі Анны Марчук.

Чакалі людзі гэтага свята здаўна. І вось у суботу а 17-й гадзіне пачаўся фэст, які ўдастоілі беларускія дыпламаты (консул Наталля Міськевіч і віцэ-консул Аляксандр Маргулян), кіраўнікі Міхалоўскай гміны (войт Марэк Назарка і старшыня Рады Мікалай Варона) ды беластоцкія госці (радны Падляшскага сейміка Мікалай Яноўскі, рэктар Вышэйшай менеджэрскай школы Міхал Лісоўскі, дырэктар Ваяводскага праўлення меліярацыі і воднага абсталявання Роберт Жылінскі ды старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі).

Адкрываючы фэст, войт гміны і старшыня ГП БГКТ у сваіх прамовах падкрэслілі важнасць беларускай культуры, якая глыбока ўкаранілася ў нашым асяроддзі. Гэта блізкая нашым сэрцам спадчына продкаў, аб якой не забываем, доказам чаму з'яўляецца фэст „Бандароўская гасцёўня”, а таксама падтрымка беларускай культуры гміннымі ўладамі ці будова культурных аб'ектаў.

— Выходзячы насустрач спадзяванням і патрэбам жыхароў салэцтва Бандары, — сказаў войт Марэк Назарка, — мы рашылі пабудаваць новую сцэну, якая за момант будзе пасвячана і здадзена ў карыстанне. Хай яна служыць вам, дарагія жыхары, вашым дзецям і ўнукам як найдаўжэй і як найлепш не толькі пры нагодзе „Бандароўскай гасцёўні”. Хай яна будзе сімвалам інтэграцыі вашай культуры і традыцыі.

Затым чын пасвячэння сцэны здзейснілі настаяцель Праваслаўнага прыхода ў Юшкавым Грудзе а. Славамір Тафілюк і святар Каталіцкай парафіі ў Ялоўцы кс. Войцех Новаша ў суправаджэнні царкоўнага хору.

Мастацкую частку склалі выступленні айчынных хароў і калектыву „Белыя росы” з Гродна. Артысты з Беларусі заваражылі публіку сваімі спевамі і танцамі ў выкананні прывабных дзяўчат і стройных хлопцаў. Народу вельмі спадабаліся песні з глыбокай думкай пра чалавека, яго адвечныя мары, жаданні, пачуцці, сумненні, пошукі шчасця, пра радасць і драматызм жыцця, прыгажосць навакольнага свету. Гродзенскія спевакі выступілі па-майстэрску пад такі ж акампанемент баяністаў, скрыпачоў, цымбалістаў, бубнача і дудара. Захапленне публікі выклікалі таксама нашы калектывы — „Куранты” з Бельска-Падляшскага, „Рэха пушчы” з Гайнаўкі, „Расспяваны Гарадок” ды гурт Гміннага асяродка культуры з Міхалова.

Арганізатары фэсту, у ліку якіх быў і ніжэйпадпісаны, сардэчна прынялі спевакоў і танцораў на новенькай, вялікай, прыгожай сцэне, з якой перад выканаўцамі распасціралася мяляўнічая панарама. Сонечнае ліпеньскае надвор'е прыцягнула шматлікую публіку — не толькі бандарскую. На фэст прыехалі людзі з розных куточкаў нашай краіны. А гэта найлепшы доказ, што беларускі фэст патрэбны нашаму народу. Спадзяюся, што „Бандароўская гасцёўня” адбудзецца і ў чарговы раз — дзевяты, дзесяты...

http://svislac.belarda.org

„Ніва” ўжо неаднойчы распавядала аб рэгіянальных сайтах Беларусі. Найбольшая іх важнасць у тым, што яны ў нечым падобныя на рэгіянальныя газеты. Тут таксама падаецца шмат інфармацыі аб мясцовым жыцці, побытавых патрэбах людзей, іх, можа не надта вялікіх, але надзённых, жыццёвых інтарэсах.

Адным з сайтаў, што распавядаюць пра мясцовыя жыццёвыя праблемы часткі Мінскай вобласці, з'яўляецца інтэрнэт-рэсурс „Свіслач”. Месціцца ён у інтэрнэце па адрасе http://svislac.belarda.org.

Пэўна той, хто цікавіцца геаграфіяй сталіцы Беларусі ведае, што Свіслач — гэта рэчка, што працякае па Мінску. Яна не надта вялікая і вялікага судаходнага значэння ніколі не мела. Разам з тым рэчка мела вялікае значэнне для жыхароў мястэчка Свіслач, якое з'явілася на карце Беларусі толькі ў 60-я гады мінулага стагоддзя. Менавіта аб гісторыі з'яўлення гэтага маладога паселішча выдатна распавядаецца на старонцы „Гісторыя Свіслачы”. Адсюль мы можам даведацца, што горад Свіслач узнік літаральна на голым месцы, сярод лясоў, як месца жыхарства працаўнікоў воскавага завода, што рабіў тэхнічныя парафіны на патрэбу савецкага ваенна-прамысловага комплексу.

Аб месцапалажэнні Свіслачы распавядаецца на „геаграфічнай” старонцы. „Свіслач знаходзіцца ў 25 кіламетрах на паўднёвы ўсход ад г. Мінска ў Пухавіцкім раёне, — пішуць аўтары сайта. — Адлегласць пры паездцы па аўтамабільных дарогах — 35 км ад Мінскай кальцавой аўтадарогі. Пасёлак Дружны — у двух кіламетрах ад Свіслачы. Дружны і Свіслач з'яўляюцца адной адміністратыўнай адзінкай — тэрыторыяй Свіслацкага пасялковага савета”.

Згодна з самапрэзентацыяй сайта, якая месціцца ў рубрыцы аб партале, рэдакцыя партала ў сваёй працы імкнецца да аб'ектыўнасці, аператыўнасці і штодзённага абнаўлення. „Мы асвятляем тэмы, якія рэальна кранаюць інтарэсы жыхароў Свіслачы, Дружнага і бліжэйшых паселішчаў. Асноўны крытэр пры адборы інфармацыі — яе карысць для насельніцтва і аб'ектыўнасць”, — кажуць аўтары сайта. І гледзячы на тое, што сайт не цураецца такой важнай тэмы для жыхароў наваколля як будаўніцтва хімічнага завода, сваю мэту ён дасягае.

Менавіта будаўніцтва хімічнага завода стала летась адной з найгалоўнейшых тэм беларускай незалежнай медыя-прасторы, а дакладней кажучы — акцыі пратэсту свіслачан супраць будаўніцтва экалагічна небяспечнага прадпрыемства і рэпрэсіі ў адносінах да нязгодных. Аб гэтым мы можам прачытаць на старонцы „Інфармацыя па будоўлі завода Август-Бел”.

Не пакідаюць па-за ўвагай аўтары сайта і ход падрыхтоўкі да выбараў у беларускі парламент. Многія грамадскія актывісты, нягледзячы на заклікі да байкоту гэтага мерапрыемства, спрабуюць паўдзельнічаць у іх. Ці варта гэта рабіць — адкажа час.

Калі паглядзець на сайт вачыма скептычнага інтэрнэт-карыстальніка, то прыходзіш да высновы, што партал ніякім чынам не можа прыцягнуць да сябе ўвагу. Тут мы не знойдзем ніякіх каляровых аздабленняў, а колькасць фотаздымкаў мінімальная. Але галоўная мэта сайта — інфармаванне аб падзеях у Свіслачы і бліжэйшым наваколлі — выконваецца. А калі неабыякаваму карыстальніку хочацца нейкім чынам паўплываць на змест і якасць партала, то ён можа прыняць удзел у апытанні, якое знаходзіцца з левага боку выяўлення.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

СПОРТ

Пекінскае пекла

Вось і стартавала алімпіяда ў сталіцы Кітая. Пакуль невядома, якімі спартовымі дасягненнямі будзе яна адзначана, але ўжо можна сцвярджаць, што пекінскія гульні сталі аднымі з найбольш палітызаваных у гісторыі правядзення сусветных алімпіяд. Мяркуючы па ўсім, можна прагназаваць, што гаспадары форуму ўпершыню ў гісторыі зоймуць першае месца па якасці медалёў. Прычынамі таму і рэзкі скачок развіцця тых відаў, дзе раней кітайцы не былі завадатарамі, і звыклы для іх клімат (многія з удзельнікаў наракаюць на пекінскае пекла), і неверагодныя прэміяльныя, якія паабяцаў урад (ажно мільён долараў за залаты медаль!). За другое агульнакамандавае месца напэўна будуць змагацца ЗША і Расія. Іншыя моцныя дружыны будуць імкнуцца трапіць у дзесятку.

Беларусь прадстаўлена на алімпіядзе як ніколі шырока — у Паднябесную прыехалі 184 атлеты і 77 трэнераў у 25 дысцыплінах. Па відах спорту наша прадстаўніцтва размяркоўваецца наступным чынам: лёгкая атлетыка — 50, акадэмічнае веславанне — 13, баскетбол — 12 (жаночая дружына), цяжкая атлетыка — 10, плаванне — 9, мастацкая гімнастыка, веславанне на байдарках і каноэ, стральба — па 8, спартовая гімнастыка — 7, вольная барацьба, веласпорт, тэніс — па 5, бокс, грэка-рымская барацьба, дзюдо, скачкі ў ваду, ветразевы спорт, сучаснае пяцібор'е, настольны тэніс, фехтаванне — па 4, конны спорт — 3, сінхроннае плаванне, скачкі на батуце, стральба з лука — па 2, бадмінтон — 1. Усяго ж на алімпіядзе будзе разыграна 302 камплектаў узнагарод у 38 відах спорту.

Гэта ўжо чацвёртая алімпіяда для суверэннай Беларусі. Найбольш удалым быў удзел у аўстралійскім Сіднеі ў 2000 годзе — тады нашы здабылі ажно 17 медалёў, у 1996 годзе ў Атланце і ў 2004 годзе ў Афінах было па 15. У складзе сённяшняй дэлегацыі багата дэбютантаў, не забракла і дасведчаных атлетаў. Прыкладам, для настольнага тэнісіста Уладзіміра Самсонава гэта ўжо 4-ы ўдзел у алімпіядах. Стралок Канстанцін Лукашык быў чэмпіёнам яшчэ барселонскай алімпіяды 1992 года. А 48-гадовая дыскаболка Эліна Зверава, чэмпіёнка Сіднея, выступала яшчэ ў 1988 годзе ў карэйскім Сеуле. Для легендарнай Кацярыны Карстан (у дзявоцтве Хадатовіч) гэта будзе ўжо 5-ы старт, яна ж найбольш тытулаваная з усіх беларусаў (двухразовая чэмпіёнка, уладальніца сярэбранага і бронзавага медалёў у розныя гады). Сёлета кіраўніцтва беларускім спортам упершыню не рабіла гучных прагнозаў і не агучвала медальнага плана. І гэта правільна — лішняя балбатня нікому непатрэбная. У аўтара гэтых радкоў, як і ў кожнага заўзятара, ёсць свае асабістыя сімпатыі. На маю думку, больш зацята хварэць за канкрэтнага прадстаўніка нашай краіны можна толькі па суме спартовых і чалавечых якасцей. Не сакрэт, што некаторыя з чэмпіёнаў пастаўлены на службу дзяржаўнай прапагандзе і стараюцца ўсімі сіламі выконваць такую „місію”. Іншыя, наадварот, захоўваюць годнасць і незалежнасць у выказваннях.

Алімпіяда праходзіць пад покрывам страху і боязі быць злоўленым у прымяненні допінгу. З аднаго боку гэта вельмі добра, што антыдопінгавыя службы ўрэшце рашуча ўзяліся за „чыстку”. З іншага боку, працэс ужывання анаболікаў мае амаль татальны характар і зайшоў занадта далёка, да таго ж не выключаны пэўныя правакацыі і спекуляцыі. Мабыць, выніковы медальны багаж з-за дысквалі фікацый будзе не раз карэктавацца.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

ГАРАЧЫ ЧАС

Тэкст і фота
Уладзіміра СІДАРУКА

Над нялёгкай доляй селяніна, як і рэнтабельнасцю сельскагаспадарчай вытворчасці, задумваўся Аляксей Мароз у цыкле артыкулаў „Раз на возе, раз пад возам". Не стану затым паўтарацца за аўтарам і абмяжуюся да будняў сёлетняй штодзённічыны ды праблем, якія хвалююць земляробаў. Гэта праўда, што жыта буйным парасло. Але іншай праўдай з'яўляецца і тое, што зацяжныя дажджы паўплывалі на рост пустазелля і паклалі збожжа. Мой сябрук-аднавясковец вымушаны быў, напрыклад, карыстацца касілкай, паколькі спавітае пустазеллем калоссе так было пераблытаным, што нельга было касіць камбайнам. Такое ж я бачыў каля Грабаўца. Але не адна гэта праблема. Жніво зацягваецца. Шмат някошанага жыта застаецца на полі, ярына даспявае і атаву касіць трэба. Работы ўсё больш. У гаспадарцы наступіў гарачы час. Няма адпачынку, прытым натура капрызнічае. Як не зацяжныя дажджы, то спёка дакучае. Трыццаціградусная гарачыня датэрмінова засушыла на полі збожжа і бульбу. Калі спёка будзе працягвацца, тады збожжа можа абсыпацца. Які плён будзе, цяжка прадбачыць.

Цэны сельскагаспадарчых паслуг надта высокія. Калі я спытаўся ў сябра пра цану гадзіннай працы камбайна, гэты адно рукой махнуў: „Лепш не гаварыць, — сказаў. — Не вартая аўчынка вырабу". Таму многія сяляне адмаўляюцца наймаць камбайн і косяць касілкамі. Снапочкі акуратна ставяць у ляшкі, як гэта бачым на здымку. Старажылы маўлялі: „Да Пятра баба хлеба напякла". Значыць, калісьці жніво канчалі да 12 ліпеня, хоць касілі ўручную. Снапочкі з поля звозілі да „Льяша" (2 жніўня — дзень св. пра-

рока Ільі). Практычна абазначае гэта канец лета і прадвяшчае надыход восені. Народная пагаворка напамінае: „Ад святой Ганкі халодны вячоркі і ранкі" (7 жніўня). Селяніну прадвяшчае гэта чарговы перыяд палявых работ: узлушчэнне поля, уборку бульбы і пасяўную. Так будзе ўжо да позняй восені. Калі хто не пакарыстаўся камбайнам, чакае яго малацьба, а таксама рыхтаванне паліва на зіму. А з гэтым звязаны чарговыя выдаткі. Калі зробім скрупулёзны баланс прыбыткаў і выдаткаў гадавой працы земляроба, тады можам сказаць ці селянін апынуўся на возе, ці пад возам. Але прыклад сёлетніх анамалій пэўна тым разам кажа сялянам апынуцца пад возам.

Будзе ў нас святліца!

У чэрвені дэлегацыя ад вёскі Бялкі Нарваўскай гміны ў саставе: адстаўны палкоўнік ПВ пастаянны жыхар Беластока, летам жыхар Бялок Яўген Вайткоўскі, Аляксандр Нікіцюк, Юрый Андраюк і аўтар гэтага допісу паехалі да войта Нарваўскай гміны сп. Якуба Садоўскага. Гаворка была аб даездах жыхароў вёскі ў гміну ці ў Беласток, аб пабудове адрэзка жвіраванай дарогі з вёскі Бялкі ў вёску Іванкі ды аб рамонце будынка былой малачарні і перабудове яго на святліцу. Шчыра мы паразмаўлялі. Войт прызнаўся нам, што не мае магчымасці загадаць транспартнаму прадпрыемству ПКС каб памяняла яно свае курсы, а пра гэта трэба хадайнічаць перад Маршалкоўскай ўправай у Беластоку.

Што датычыць пабудовы адрэзка дарогі, дык войт сказаў, што перадаў грошы ў павятовае староства ў Гайнаўцы на выкананне планаў на згаданы адрэзак дарогі і староства мае распачаць і закончыць пабудову дарогі ў 2009 годзе. Калі пачалі весці гутарку аб рамонце будынка малачарні на святліцу, дык аказалася, што там у адным пакойчыку змяшчаюцца прылады добраахвотнай пажарнай каманды. Войт паклікаў працаўніка гміны, што займаецца справамі рамонтаў Станіслава Карабкевіча і мы разам разважалі, што рабіць. Пан Стась падсунуў думку, каб заказаць бляшаны гараж 5 на 3 метры, паставіць яго, упарадкаваць яго, парабіць там паліцы і туды перанесці пажарныя прыдады, а два пакойчыкі адрамантаваць на вясковую святліцу. Вось улетку прыедуць унукі да сваіх бабуляў і дзядоў, і будуць мець дзе культурна правесці час! Войт сказаў, што гэта ў яго моцы. І войт стрымаў слова: ужо стаіць бляшаны гараж для пажарнікаў.

Што тычыцца самога будынка малачарні, то ўжо каля 20 гадоў, калі войтам у Нарваўскай гміне быў Ян Тапалянскі, дык ён сказаў, што адкупіў быў будынак ад гайнаўскага малочнага прадпрыемства за сімвалічную цану 1000 злотых, але папераў на гэтую куплю пажарнікі не мелі і ў мінулым годзе войт Якуб Садоўскі зноў заплаціў сімвалічную цану 1000 злотых для малачарні і перадаў будынак у карыстанне камандзе бялоцкіх пажарнікаў. Калі закончыцца рамонт будынка, жыхары вёскі Бялкі будуць вельмі ўдзячны войту!

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

З вандровак па вуліцах

Зараз у Супрасль прыязджае шмат турыстаў і курортнікаў. Для іх важна як трапіць у гатэль, у краму, на пошту ці ў аптэку. Для гэтага шукаюць дошак з назвамі вуліц. З гэтым дошкамі ў Супраслі бывае парознаму і хацелася б, каб было лепш.

Выблеклі або і паржавелі бляшаныя дошчачкі між іншым па вуліцах Новай і Зялёнай ды па вул. Чылічанскай. З некаторых увогуле не даведаешся, бо нічога не прачытаеш.

І яшчэ. Па вуліцах Канарскага, Новай і 11 Лістапада пагнулі-зруйнавалі дарожныя знакі. Па вул. Новай слупы электрычнага асвятлення стаяць радком пасярод тратуара. Мала таго, пасярод тратуара там-сям растуць елкі ды сосны. Адна вялікая ды тоўстая сасна расце на маставой (!) пры бардзюры. Ноччу яе нялёгка заўважыць. Няма пры ёй ніякай загарадкі. Ад вуліц Новай пачынаюцца дзве вуліцы. Ды ёсць вуліцы, але дошчачак з іх назвамі няма. Вось такія непаладкі ў горадзе Супраслі.

Больш прыгожых сялянскіх сяліб

Кожны год у Нараўчанскай гміне праводзіцца конкурс на найпрыгажэйшыя сялянскія сялібы. Ён карыстаецца ўсё большай папулярнасцю.

Найбольш прыгожых прыдамашніх кветкавых агародчыкаў ды дамоў і панадворкаў маем зараз у Нараўцы, Семяноўцы, Плянце, Ляўкове і Забалотчыне.

Да конкурсу прыступілі жыхары Альхоўкі, Міклашэва, Мінкоўкі (Беглюкоў) і Старога Двара. Гэта добра, гэта цешыць. У гэтым годзе адважыліся ўпершыню прыступіць да конкурсу жанчыны з Мінкоўкі, Скупава і Старога Двара. **(ян)**

Адгаданка

1. прозвішча беларускага першадрукара, 2. дзяржава з Капенгагенам, 3. ззяючая кропка на начным небе, 4. драпежная птушка, якую калісь выкарыстоўвалі пры паляванні на дробных звяроў і птушак (*Falco*), 5. апошняя фраза малітвы, 6. травяністая расліна, якой маладыя чаранкі ўжываюцца ў ежу, напр. на кампот (*Rheum*), 7. „доўгая" паўднёваамерыканская дзяржава, 8. Іпацій, праваслаўна-уніяцкі іерарх, заснавальнік Брэсцкай уніі (1541-1613), 9. аб'ект пакланення язычнікаў, 10. спецыяліст па юрыдычных пытаннях, 11. месца працы прэстыдыжытатара, 12. свая бліжэй да цела, 13. цынічны чалавек, 14. парнакапытная млекакормячая жывёліна з галінастымі рагамі.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — шведская прыказка.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 28 нумара ААН, борць, грыўня, джаз, дзед, Об, піла, Рэйн, Юра.

Рашэнне: **Добры ўраджай не збіраюць з дрэннага поля.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Галене Тапалянскай** з Трасцянкі і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.

Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: IV kwartał 26 zł. do 5 września 2008 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
Prenumerata z wysyłką za granicę **pocztą zwykłą** wynosi: kwartalna — 131 zł.; półroczna — 224 zł.; roczna — 374 zł. **Pocztą lotniczą**: Europa — prenumerata kwartalna — 142 zł., półroczna — 243 zł., roczna — 405 zł. Ameryka Północna, Południowa, Środkowa, Afryka, Azja — prenumerata kwartalna — 160 zł., półroczna — 274 zł., roczna — 456 zł. Australia i Oceania — prenumerata kwartalna — 204 zł., półroczna — 350 zł., roczna — 583 zł.
Wpłaty do 5 dnia miesiąca poprzedzającego prenumeratę przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A. IV O/ Warszawa,
Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.

Prenumeratę można zamówić w redakcji. Planowana ilość numerów „Niwy" w 2008 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,65 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.
Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

Бабскія гісторыі

Насціна багацце

Буслы над родным полем

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Вось і не хацела славутай быць, а прыйшлося... Адны свае пяць хвілін віртуальныя займела. Бо тая славутасць калісьці на цэлулоіднай плёнцы, цяпер на лічбавых параметрах вышэйшай матэматыкі, як бы ні было — заўжды мімалётная. Хіба што хто стане сапраўднай кіназоркай, пра якую будзе гаворка нават праз вякі, калі нават фільм, у якім выступала, быў нямы.

Настасся Трохім, усё ж, штосьці з тае колішняе кіназоркі мае. Ёй ужо восемдзесят першы год ідзе, а, на першы пагляд, убачыўшы, як каляровую сукенку ды пушыстыя, памаляваныя ў натуральны русы колер валасы, злёгку звязаныя бантам, развейвае ліпеньскі вецярок, ніхто не даў бы ёй на „Сяброўскай бяседзе" такіх гадоў. Муж у яе амаль на дваццаць гадоў ад яе маладзейшы. Да танца хапалі яе маладыя хлопцы, ды не да танцаў ёй было. Перадалі ёй у Торунь, што яе малодшы брат Віктар трапіў у беластоцкую бальніцу, што кепская з ім справа. Пасля аперацыі лёгкага, якое захапіў рак, 66-гадовы Насцін брат у крытычнай сітуацыі. Усё ж, трымаецца, і можа толькі пытацца ў лекараў, чаго можна па ім спадзявацца, бо ж сам не скажа. Трымаюць яго ад аперацыі ў фармакалагічнай спячцы.

Спынілася была Насця ў свае хросніцы, бо з яе хаты ў Гарадку бліжэй да лекараў. А ўвесь свет пайшоў на „Сяброўскую бяседу", ды і яна, каб пабачыць суседзяў і сяброў з падгарадоцкіх вёсак. Выйшла раней, бо ж на тую паўсюдную радасць навокал клаўся змрочны цень гора. Прылегла, ды з блізкага валілаўскага лесу несліся гукі гулянняў. Да раніцы не магла звесці павек; усё думала пра брата і гора браціхі. Што ж яна, тая браціха, бяздзетная, адна рабіць будзе, калі, не дай Бог, Віктар памрэ? Гатова была Насця бегчы яшчэ ў прыцемках у вёску да браціхі, суцяшаць яе.

Ды не так і хутка пабегла ў госці ў сваю родную хату. На вуліцы звочылі яе людзі з тэлебачання. Каларытная такая пані — прыкмецілі. Дама ў квяцістай сукенцы па брукаванцы кіруецца ў другі бок чым да Беластока. Спынілі. Спыталіся. Рашылі зняць сантыментальнае падарожжа пані Настассі ў сваю родную старонку. Пані Насця замахала галавой: вось кіношнікі ўмеюць кожнаму чалавечаму руху прыдаць канцэпцыі! Адно добра, што фільмоўцы едуць у бок яе вёскі, дык пад'едзе!

Селі ў машыну тэлебачання. Настасся цягнула свой аповед пра тое, як засталася ў яе сэрцы радзіма ў той час, калі яна вандравала па ўсёй краіне ў пошуках працы і шчасця. І сюды калісь яшчэ часцей вярталася, у сваю хату, дзе нарадзілася, дзе правяла дзяцінства і маладосць. Памятае кожнае старое дрэва, што расло пры старажытным шляху. Ды як шмат што змянілася... А ля хаты, на палосцы спелага аўса, старая буслянка на электрычным стаўбе. Тутака заўжды буслы былі, ад пакаленняў. Толькі цяпер старое гняздо, з кожнай вясной аднаўлянае і мацаванае бусламі, ляжала на спецыяльнай падстаўцы, у якія для іх бяспекі забяспечваюць буслоў арнітолагі. Стаяла Насця, любавалася прапраўнукамі сваіх знаёмых буслоў, хвалявалася. Бо ж і іх штогод цягне сюды, на радзіму, і ляцяць яны тысячы кіламетраў дахаты. А фільмоўцы захапляліся прыгожым відам, які здымалі. „Вы — як кіназорка!" — не шкадавалі кампліментаў. І паехалі далей.

Настасся ад буслянкі павярнула ў прысаду, на пясчаную яшчэ вільготную дарогу, што вяла да яе роднае хаты. Там пад ліпай сядзела ейная браціха. Кінулася Насця з абдымкамі і шкадобай да сваячкі.

— А ты што, па багацце прыехала? — азвалася браціха і насунула хустку на лоб. — Чаго?

Гаспадыня, не азіраючыся на залоўку, рушыла дахаты. Зачыніліся за ёю дзверы веранды, пасля сяней. Насця засталася адна на падворку. Адно братаў коцік цёрся каля яе ног, вітаў даўно не бачаную госцю.

Насця тапталася ў сушэючай на сонцы траве, перакідаючы торбы з рукі ў руку. Урэшце рушыла да роднай хаты. Заглянула ў акно. Браціха сядзела на ляжайцы, склаўшы рукі. Насця адчыніла дзверы. Яны, тыя самыя, што іх бацька сам рабіў, скрыпелі як заўсёды, ад яе дзяцінства. Не будзе ж вяртацца ў Гарадок да хросніцы, прынамсі не паразмаўляўшы!

— Ты чаго прыехала? Дзяліць дабро? Нічога тут твайго няма! — прабурчала Зойка. Заціснула пальцы на кантовым металёвым беразе халоднай ляжайкі. — Думаеш, дастанеш што-небудзь пасля Віктара? Тут мае пляменнікі мне пасабляюць, яны добрыя. А ты сядзі ў сваёй Торуні. Раз ты пакінула ўсё ў маладосці, дык нічога табе і не дастанецца!

У родную хату яе не ўпусцілі

Насця цяжка села на крэсла. Размова не клеілася.

Пасядзела пяць хвілін. Пасля рушыла назад, пешшу, у Гарадок. Фільмоўцы, што вярталіся са здымкаў, дагналі яе ўжо на падворку хросніцы.

— Мае чаго баяцца ваша сваячка! — растлумачыў пані Насці сусед яе хросніцы. — Няма ў іх дзяцей, няма радні і ў вашага другога памерлага раней брата. І прыйдзецца ёй вам аддаць адну спадчынную частку. Або сплаціць. Будзе гэтага чвэртка ўсяго багацця.

— Ды якое там багацце там засталося! — праз слёзы сказала пані Насця. — Хіба што тыя буслы!

— Прыгожыя віды мы знялі! — аператар Андрэй стараўся ў нечым яе суцешыць. — І пані як тая зорка! Дашлем вам фільм на кружэлцы з вашага падарожжа на радзіму!

17.08 — 23.08

(22.03. — 20.04.) Добра намацаеш грунт пад нагамі, суцішышся. Лепшы час на пачуццёвыя справы. Здароўе сямейніка паправіцца. 19.08. будзеш гатовы да ўступак і негацыяцый. Задзівіш усіх сваёй здольнасцю да кампрамісу. Не рабі нічога што забаронена.

(21.04. — 21.05.) Да 19.08 добры час паказаць свае таленты. Венера і Веста ў трыгоне прыносячага шчасце Юпітэра. Магчымыя клопаты з домам (паводка, рамонт, страта ключоў...). Будзь тактычны ў кантактах з начальствам. Паправа ў фінансах.

(22.05. — 22.06.) 16 — 20.08. шчаслівыя выпадкі, лёгкасць наладжвання кантактаў, добры час на падарожжы. Мноства змен, што ледзь паспееш, але форма ў цябе знакамітая, і нічога не прапусціш!

(23.06. — 23.07.) 17 — 21.08. знакаміта дагаворышся з сябрамі, з новапазнанымі асобамі хутка зловіш кантакт. Слухаючы дарадчыкаў, шмат можаш здабыць. 20.08. адкрыюцца для цябе новыя фінансавыя магчымасці. Добрая кан'юнктура ў інтарэсах. На працы засяродзься на бягучых справах.

(24.07. — 23.08.) 19 — 23.08. прабудзяцца ў табе залежы энергіі. Выкажашся рашучасцю, нават адчаем і агромнай трываласцю. З другога боку ахопліваць будзе цябе нейкая лянота і нямогласць, непрадуктыўнасць. Будзь асцярожны, разважліва стаў кожны крок.

(24.08. — 23.09.) З 21.08. (да 25.08) благія весткі і непатрэбная спешка. Старайся быць спакойным і не ісці насуперак. У дробных справах магчымы недахоп поспеху. Ды ты цяпер вельмі прадуктыўны — можаш зрабіць такое, аб чым заўжды марыў, таксама штосьці новае. Можаш ісці ўперад як бура!

(24.09. — 23.10.) Аптымізм і вера ў свае магчымасці. Шчасце да людзей і інтарэсаў. Патолю знойдзеш у кантакце з дзікай натурай. З 19.08. возьмешся за падганянне хвастоў і пачнеш рэалізаваць адкладваныя помыслы. Рыхтуйся да змен на працы.

(24.10. — 22.11.) Да 19.08. асцерагайся насілля і рызыкоўных фінансавых прыёмаў. Не рабі нічога на паказуху! 19 — 23.08. лёгка прафарсіруеш свае рашэнні. Дар пераконвання іншых, а нават гіпнатызёрскі ўплыў на іх. Хоць адзін уік-энд правядзі з сябрамі на прыродзе.

(23.11. — 22.12.) Да 19.08. асаблівае шчасце ў каханні і ў бізнесе. Карысныя лады з людзьмі. 16 —20.08. — фантастычныя вынікі ў навуцы. Твой высілак на працы будзе ўрэшце адпаведна ацэнены. Неспадзяваныя здарэнні ў блізкім крузе.

(23.12. — 20.01.) Найлепшы час на адпачынак (хоць не мусіш ляжаць пад грушай). Не будзеш гнацца за новымі пачуццямі, задбаеш аб тое што маеш. Асоба, якая робіць фермент у тваёй сям'і, зноў пакажацца. У фінансах хутчэй лічы на шчасце, чым планаваны поспех.

(21.01. — 19.02.) З 21.08. будзеш лішне патрабавальны да партнёра. Твая цяга да незалежнасці можа быць перашкодай у будаванні шчаслівай сувязі. Прыцягваеш аматараў! Не страціш усяе маёмасці на бязглуздзіцу.

(20.02. — 21.03.) Будзь асцярожны са шкодным смакоццем. Схочаш сваёй другой палове прыхіліць неба; аб каханне трэба дбаць. Высілак укладзены ў працу прынясе немалую выручку. Хоць менш прыязна аднясуцца да цябе высокапастаўленыя людзі.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Фабіян Ярэміч ☞ I-III

Ніва
ПРА ГІСТОРЫЮ

Кастусь Майсеня ☞ IV

Фабіян Ярэміч
— „я, як прадстаўнік беларускага народу...”

Лена ГЛАГОЎСКАЯ

Найбольшую палітычную кар’еру ў міжваеннай Польшчы зрабіў Фабіян Ярэміч. На працягу трох тэрмінаў (кадэнцыяў) быў дэпутатам польскага Сейма ў 1922-1928, 1928-1930, 1930-1935 гадах. Сярод нашчадкаў за тое дачакаўся найдаўжэйшага і найбольшага маўчання, практычна дасюль. Пра Браніслава Тарашкевіча і яго Беларускую сялянска-работніцкую грамаду (БСРГ) распісвалася Аляксандра Бергман ды іншыя гісторыкі ў Польшчы і Беларусі. Пра хадэцкую плынь у беларускім руху загаварылі пасля 1990-х гадоў. А пра сялянскую плынь (Беларускі сялянскі саюз) і яе стваральнікаў Фабіяна Ярэміча і Васіля Рагулю дасюль сялянская нацыя беларусаў маўчыць, хаця іх біяграфіі змясціла „Энцыклапедыя гісторыі Беларусі”.

29 чэрвеня мінула 50 гадоў як у Калёніі пад Вільняй (зараз Павільнюс) у сваім доме пасля цяжкай працы ў агародзе ад кровазліцця ў мозг памёр Фабіян Ярэміч.

Нарадзіўся ён 20 студзеня 1891 г. як першынец у сялянскай каталіцкай сям’і Мацея і Юзэфы з Маршалкаў у Дуляўцах каля Ваўкавыска. Закончыўшы царкоўна-прыхадскую школу, пайшоў у свет шукаць лепшай долі. Маці яго памерла заўчасна. Бацька паўторна ажаніўся і паявіліся наступныя дзеці: Болесь, Юзік, Вікця, Ядвіся, Уршуля і Аміля.

Фабіян затрымаўся ў Гародні, дзе знайшоў працу пры ўстанаўліванні тэлефонаў і электрычнага абсталявання. Навучыўшыся гэтага фаху, стаў нядрэнным спецыялістам у гэтай галіне, што дазволіла яму працаваць у розных месцах Расеі, між іншым у Пецярбургу. Там здаў экзамен з 4 класаў і паступіў у электратэхнічную школу, якую закончыў у 1912 г. Атрымаў пасаду старшага назіральніка на піцерскай тэлефоннай станцыі, на якой прычакаў кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. Тады пераехаў у Вільню, з якой родам была ягоная жонка Апалонія (Польдзя), дачка агранома Урбана. У 1919 г. стаў там начальнікам тэлефонна-тэлеграфнае станцыі. Быў ім да 1922 г.

Прыехаўшы ў Вільню, уключыўся ў беларускі нацыянальны рух. У снежні 1917 г. удзельнічаў у I Усебеларускім з’ездзе ў Мінску, у 1918-1921 гг. дзейнічаў у Радзе БНР.

Партрэт Фабіяна Ярэміча, намаляваны Пятром Сергіевічам (праўдападобна пасля вяртання са ссылкі)

У 1919 г. выбралі яго старшынёй новаствоpанага Беларускага нацыянальнага камітэта. Прысутнічаў на Беларускім з’ездзе Віленшчыны і Гарадзеншчыны ў чэрвені 1919 г. Увайшоў у Цэнтральную беларускую раду Віленшчыны і Гарадзеншчыны. Запісаўся ў Таварыства беларускай школы — у верасні 1921 г. быў 54-м на спіску членаў. Заангажаваўся ў дзейнасць аднаўленага ў 1922 г. Беларускага грамадзянскага сабрання (БГС) — яшчэ даваеннай беларускай арганізацыі. Разам са Станіславам Валэйшам і Гасанам Канапацкім увайшоў у часовы ўрад, які падрыхтаваў агульны сход БГС на 16 ліпеня 1922 г. Была на ім выбрана Рада старшынь, у якую ўвайшоў і Фабіян Ярэміч, побач з Браніславам Тарашкевічам, Уладыславам Самойлам, Гасанам Канапацкім ды іншымі.

У сувязі з выбарамі ў Сейм у 1922 г. беларускія дзеячы ў Вільні 9 жніўня заснавалі Беларускі цэнтральны выбарны камітэт, якім кіраваў Антон Луцкевіч. Браніслаў Тарашкевіч да 1925 г. лічыў Фабіяна Ярэміча яго самым верным ад’ютантам. Стаў ён членам управы камітэта і адначасна кандыдатам у дэпутаты са спіска нацыянальных меншасцей № 16. Увайшоў у палату разам з іншымі беларускімі пасламі. 11 беларускіх паслоў і 3 сенатараў стварылі ў польскім парламенце Беларускі клуб, якім кіраваў Браніслаў Тарашкевіч. Тады яшчэ ўсе мелі надзею на супрацоўніцтва з польскімі ўладамі, ад якіх чакалі суб’ектнага трактавання беларусаў у Польшчы. Аднак беларускія дзеячы вельмі хутка расчараваліся ў польскіх адносінах да беларусаў. У сувязі з заснаваннем БСРГ з 1925 г. дайшло да расколу ў клубе. Грамадоўцы стварылі ўласны клуб, а апошнія дэпутаты асталіся ў Беларускім клубе (кс. Адам Станкевіч, Васіль Рагуля) і на старшыню выбралі Фабіяна Ярэміча. Стаяў ён рашуча на незалежніцкім грунце. Лічыў, што беларусы павінны яднацца на нацыянальным грунце і выступаў супраць супрацоўніцтва з польскімі партыямі.

Працаваў у сеймавай адміністрацыйнай і турэмнай камісіі, у падкамісіі па справах высвятлення адміністрацыйных злоўжываньняў на ўсходніх крэсах. Некаторыя прамовы Фабіяна Ярэміча ў камісіях ды на пленарных пасяджэннях Сейма публікаваліся ў „Krynicy”. 12 студзеня 1925 г. у дыскусіі над прапановай увядзення надзвычайнага становішча на „крэсах” у адміністрацыйнай сеймавай камісіі гаварыў: Ja, jak pradstaúnik biełaruskaha narodu, pawinien skazać adno, što nia tolki ú polskaha úradu niama nijakaj prahramy hetaha „lačeńnia”, ale niama prahramy i ú palityčnych partyjach. Bo woś, naprykład, P.P.S. — pasoł Uziembło — kazaú, što niama na tak-zwanych „Kresach” nacyjanalnaha pytańnia, i što tolki treba zrabić nikatoryja socyjalnyja reformy, i úsio budzie dobra. Pasoł Prahier, tak-sama P.P.S., prapanuje rezalucyju ab aútanomii (nia wiedaju ci ščyra...), a pasoł Płaúski kaža, što ú Sawieckaj Biełarusi nadta kiepska, što tam aryštoúwajuć dziejačoú biełaruskich. Jak z hetaha bačym, u samaj lawicowaj partyi Polščy, P.P.S., niama prahramy adnosna nacyjanalnych mienšaściaú. Niama hetaj prahramy i ú centry Sojmu, a jość prahrama tolki ú polskaj prawicy, katoraja wyrazna stawić pytańnie: úsio, što jość biełaruskaha, źniščyć. A kali my pahladzim na kolkihadowuju historyju — ad 1919 hodu, to úsia palityka polskaha úradu išła ú kirunku imienna niščeńnia úsiaho biełaruskaha... Sielanin naš u Polščy ziamli nie dastaú, bo jaje zabraú asadnik; biełaruskamu wučycielu nie dajuć škoły i ahułam biełaruskaha intelihenta nie prymajuć na słužbu... Pasoł Prahier kazaú, što my maładyja palityki i što my bywajem časam naiúnymi. Tak, da adnej rečy pryznajusia: my byli naiúnyja, kali pawieryli hienerału Sikorskamu, katory kazaú: „Bracia białorusini i ukraińcy! Do Was wyciągnięta jest ręka polska!” My tady naiúna pawieryli i padali ruku hien. Sikorskamu, jaki druhoju rukoju daú nam pačuć swaju úładu... Ja staúlu dwa pytańni: ci jość biełarusy ú polskaj dziaržawie, ci niama?... Adkaz jasny: što jość, bo najlepšy dokaz hetaha toje, što pradstaúniki biełaruskaha narodu siadziać nawat u hetaj wysokaj kamisii. A kali jość biełaruski narod, to jon pawinien atrymać naležnyja jamu prawy. Kali wy nie daścio, to jon sam ich zdabudzie. Abo astajecca druhi wychad: wyrazać da adnaho úsich biełarusaú, tady budzie sprawa zlikwidawana. Pry wyniatkowym stanie i pry kruhawoj parucy, prawica dumaje, što heta zro-

працяг ☞ II

bić. Dumaju adnak, što apošniaje nia údasca, bo nadta úžo mnoha budzie raboty i nadta mnoha nas jość, kab heta možna było zrabić!... Čuú tut pieršy raz za dwa hady ad dwuch pasłoú prapazycyju, što treba hawaryć z pradstaúnikami biełarusaú i úkraincaú i z imi dahawarycca, bo, pa ich pierakanańni, heta budzie najlepšy lek dziela „Kresaú". Witaju hetu prapazycyju i, kali buduć hawaryć ščyra, to možam u mnohim dahawarycca. Kančajučy zajaúlaju: što wyniatkowyja stany nie pamohuć, hienerał-wajawody taksama ničoha nia zrobiać. Dziela hetaha prapanuju: 1) Źmianić hienerał-wajawodaú i wywieści wojska, jakoje raskwatarawana pa wioskach; 2) Skasawać daraznyja sudy; 3) Asyhnawać kredyty i, jak najchutčej, dać dapamohu Biełaruskamu i Ukrainskamu narodu na škołu i adbudowu; 4) Prawiaści ziamielnuju reformu i skasawać wajskowaje asadnictwa" („Krynica" № 5, 1.02.1925 г., с. 2-3).

У адміністрацыйнай і загранічнай камісіях у дыскусіі над законам аб чужаземцах Фабіян Ярэміч гаварыў: „Da hetaha času my, pradstaúniki Biełaruskaha Narodu, nia čuli niwodnaha razu ú Sojmie, ni ad pradstaúnikoú lewicy, ab tym, kab wydać ustawu, jakaja dawała-b mahčymaść chutčej i lahčej atrymać biełaruskamu hramadzianinu pašpart („dowód osobisty"), nia hledziačy na toje, što nie adzin raz my ab tym hawaryli i padali śpiešnuju prapazycyju. Ustawaú wydana úžo niekalki, jakija úsiakimi „kručkami" pieraškadžajuć zdabyć našamu, ú pieršuju čarhu, intelihentu, a tak-ža i sielaninu, hety samy pašpart. Ustawa „o cudzoziemcach" usia ad pačatku da kanca našpikawana hetymi samymi „kručkami", ci tak-zwanymi „fortkami", jakija dajuć — prosta nieahraničanuju ўładu starostam i wajawodam, i hetym samym dajuć im mahčymaść zusim biezadkazna wyrašać los taho ci inšaha hramadzianina; takim čynam wy, panowie, chočacie addać na łasku, ci nia łasku panoú palicyjantaú 99% biełaruskaha nasialeńnia, bo kali da hetaha byli nad nami ździeki, to heta rabiła administracyja nia praúna, a ciapier panowie chočacie prawiaści hetuju ústawu praz Sojm i tym samym usie biazpraúi administracyi zrabić praúnymi. (...) Starosta ci palicyjant moža zaličwać taho ci inšaha hramadzianina da toj ci inšaj dziaržawy na padstawie solidarnaści (prychilnaści); ja paprasiú-by pradstaúnikoú Ministerstwa Unutranych Spraú, kab adkazali, dzie znak hetaj prychilnaści, da jakoj dziaržawy, i ú čym jana pawinna wyjaúlacca? Mnie naprykład padabajucca paradki ú Šwajcaryi i ja salidarny z imi. Ci na padstawie hetaha, jak končycca moj mandat u Sojm, starasta Waúkawyskaha pawietu zaličyć mianie Szwajcarcam? Polskaha dowadu asabistaha nia maju, bo nia tolki nie dajuć dowadaú asabistych, jak ja úžo kazaú, biełaruskaj intelihencyi i sialanam, ale nie dajuć pašpartoú i biełaruskim pasłom. Heta było ú Wilni. Kamisar uradu nia wydaú pašpartu pasłom Rak-Michajłoúskamu, Kachanowiču i sen. Bahdanowiču. Dyk što-ž z biełaruskim sielaninam? — Dziela taho, što biełarus pačynajecca na litaru „B" palicyja lohka moža jaho nazwać balšawikom, zajawić, što jon „solidaryzuje się z Rosją Sowiecką" i „wysłać do Rosji". Wot wam, panowie, abraz skutkaú hetaj ustawy dziela nas biełarusaú. Usia hetaja ustawa sumyśla skirawana prociú nas. (...) Panowie nia tolki daicio administracyi šyrokaje pole da nadužyćciaú i swawoli nad našaju ludnaściu, ale zamykajecie darohu dziela skarhaú na hetyja nadužyćcia, heta značyć: što starasta zrabiú — to i świata, bolš nikudy nia majem prawa skardzicca. (...) Dziela úsiaho skazanaha ja prapanuju adkinuć henuju ústawu" („Krynica", № 27, 21.06.1925 г., с. 2-3).

У скліканні 1922-1928 гг. Фабіян Ярэміч 13 разоў прамаўляў з сеймавай трыбуны. За кожным разам ставаў у абароне беларусаў, беларускага школьніцтва ды проціў злоўжыванняў польскае адміністрацыі, у абароне Грамады, супраць выдачы ейных паслоў суду, хаця яе прыхільнікам не быў і яе заснаванне лічыў шкодным для беларускай справы. Таму з паслом Васілём Рагулем у сакавіку 1926 г. стварылі Беларускі сялянскі саюз. З 6 снежня 1925 г. Фабіян Ярэміч пачаў выдаваць два разы на тыдзень газету „Сялянская ніва". Выдавалася яна да 7 ліпеня 1930 г. На працягу амаль 5 гадоў выйшла 199 нумароў, некаторыя канфіскаваліся паліцыяй, а рэдактары падпадалі пад судовую адказнасць, уключна з выдаўцом. Летам 1926 г. па ініцыятыве Фабіяна Ярэміча і кс. Адама Станкевіча ў Вільні заснаваўся Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры, які ў даволі хуткім часе развіў сетку больш чым 40 сваіх гурткоў, напрыклад, у Парослах і ў Белавежы на Беласточчыне. Быў адным з заснавальнікаў беларускай друкарні імя Францішка Скарыны ў Вільні. Як успамінаў Язэп Найдзюк, якога маці была сястрой Фабіяна Ярэміча, „паўстала ціхая суполка. У склад яе ўвайшлі пасол на сойм кс. Адам Станкевіч, пасол на сойм і старшыня Беларускага Пасольскага Клюбу Фабіян Ярэміч, кс. Вінцук Гадлеўскі — пробашч з Жодзішак і змагар за беларускую мову ў Каталіцкім Касьцеле на Беларусі, дый кс. Андрэй Цікота — ігумен кляштару Айцоў Марыянаў беларусаў у Друі. Запраектаваная імі друкарня мела ўзнавіць дзейнасьць друкарні Фр. Скарыны ў Вільні з прад 400 гадоў, ды служыць адраджэньню беларускага народу. (...) Арганізацыйныя захады над стварэньнем беларускай друкарні ў Вільні пачаліся вясною 1926 г. Вёў іх, ад імя ціхае суполкі, пасол Фабіян Ярэміч, а асыставаў яму малады ў гэны час хлапец Язэп Найдзюк" (С. Цыпрыяновіч, *Беларуская друкарня імя Францішка Скарыны ў Вільні (1926-1940)*, Лёндан 1991, с. 5).

У 1927 г. прадстаўнікі нацыянальных меншасцей пачалі выдаваць чатырохмоўны (польска-нямецка-французска-англійскі) часопіс „Natio". У выдавецкім камітэце апынуўся і Фабіян Ярэміч. У № 1-2 пісаў пра становішча беларусаў пасля І сусветнай вайны, ацэньваючы вельмі крытычна польскія ўлады. Успамінаючы акт 25 сакавіка 1918 г., пісаў: „akt ten ma dla narodu białoruskiego doniosłe, epokowe znaczenie, albowiem hasło niepodległości staje się odtąd myślą przewodnią całego ruchu politycznego białoruskiego" (F. Jeremicz, *Białorusini, ich obecne położenie polityczne i ich dążenia*, „Natio" 1927, № 1-2, с. 18).

У дыскусіі над праектам бюджэту Міністэрства ўнутраных спраў у чэрвені 1924 г. крытыкаваў палітыку польскіх улад у адносінах да беларусаў: „Linia polityki względem nas, Białorusinów i Ukraińców, została wytknięta jeszcze w r. 1920 po rozdziale Białorusi i po zatwierdzeniu Traktatu Ryskiego. Ta polityka streszcza się w kilku słowach, a mianowicie: część Białorusi, która została wcielona do Rzeczypospolitej Polskiej trzeba połknąć, a to co jest białoruskie, co jest świętością tego narodu, zniszczyć i spolonizować, nie bacząc na to, że do dziś dnia bardzo wielu polityków i w społeczeństwie polskim mówi się o tym, że Polska nie może połknąć tych ziem i trzeba się liczyć z tą ludnością. Jednak Ministerstwa Spraw Wewnętrznych to wcale nie obchodzi. (...) Nie jestem wielkim optymistą i nie wierzę, by ktoś przyszedł, dał nam wolność i zagwarantował możność swobodnego rozwoju kulturalnego, społecznego i politycznego, ale przyszedłem do przekonania, że myśmy dotąd prosili, a teraz prosić nie będziemy, lecz będziemy brali. Przechodząc do spraw administracji, powinienem zaznaczyć, że wszystkie pisma białoruskie, jakie są, zostają zamykane i to w ten sposób, że komisarz miasta Wilna, jeżeli mu się nie podoba jedno słowo, jeden wyraz w gazecie, zamyka ją, lub ewentualnie konfiskuje i oddaje sprawę do sądu. Sąd zaś uniewinnia, ale to kładzie się ciężarem na nas, bo my do tego czasu nie mamy swojej prasy, gdyż jesteśmy ciągle szykanowani. W tym czasie zamknięto sześć pism białoruskich, skonfiskowano zaś około 60 numerów. To w żadnym państwie europejskim się nie praktykuje. To samo widzimy co do szkół. Nie będę mówił o szkołach, bo to należy do Ministerstwa Oświaty, jednakże Ministerstwo Spraw Wewnętrznych bardzo dużą tu odgrywa rolę, bo wszyscy nauczyciele, którzy są inteligencją, mózgiem twórczym tego ludu są szykanowani, nie dajecie im obywatelstwa, a tym samym zmuszacie do ucieczki ze swego kraju, do opuszczania swoich rodzinnych chat, żeby iść gdzieś na obczyznę. Stowarzyszenia nasze nie mogą się doczekać legalizacji. (...) Jeżeli Białorusin stara się o dowód osobisty, to wchodzi w błędne koło, musi iść do wójta, od wójta do starosty, od starosty do wojewody, od wojewody do referenta, w końcu do ministerstwa, a potem ministerstwo oddaje jeszcze na sprawdzenie, na inwigilację policyjną i w końcu chodzi w koło dwa lata i w żaden sposób nie może otrzymać dowodu osobistego. Jeżeli miał posadę, to ją stracił, bo nie przedstawił tego papierka" (132 posiedzenie Sejmu z 16.06.1924 r.).

№ 10. Год II.

СЯЛЯНСКАЯ НІВА

Орган Беларускага Сялянскага Саюзу.

† Кс. К. СТЭПОВІЧ

(КАЗІМІР СВАЯК) — Беларускі паэт.

Сялянства і сацыялізм.

Віньетка газеты „Сялянская ніва"

Фабіян Ярэміч, крытычна настаўлены да Грамады, быў прадметам атакі ў грамадоўскай прэсе, асабліва з боку Антона Луцкевіча, яшчэ нядаўняга сябра. Крытыкавала яго таксама паланафільская прэса, напрыклад, „Беларускае слова" (№ 3, 18.02.1926 г., с. 4) у „Нашым сатырыконе":

„Ці ж ня пекна выглядае?
Пудоў восем вагі мае;
Хмелям чуб яго ўецца
Як ідзе — дык брух трасецца.
Вочы ледзь відаць, а нос —
Дык саўсім у сала ўрос.
(...)
Быў скрамнюсянькі манцёр.
Ведаў як званкі направіць,
Тэлеграфны стоўб паставіць
Чуў што-не-шта і пра „ток",
Словам — знаньнем не далёк
Шансаў на кар'еру мала
Ды вось бач: пашанцавала!
Да Антонія прыткнуўся
На Алімпе апынуўся.
(...)
Выйшаў ён з пад рук начальства.
Манарха слухаць перастаў,
Нешта сам рабіць пачаў.
З Рагуляй вайшоў у хаўрус,
Адкрылі неякі „Саюз",
Газэты сталі выдаваць,
Там сябе рэклямаваць...
Зусім ясны іхні плян:
Скааптаваць сабе сялян,
Пры дапамозе гучных слоў —
Іх галасы дастаць ізноў".

Побач з гэтым памфлетам змешчана таксама карыкатура дэпутата, магчыма размаляваная Францішкам Аляхновічам. Ён магчыма і быў аўтарам сатырыкона. „Беларускае слова" выдавала Часовая беларуская рада.

Нягледзячы на крытыку, якая мела выразны палітычны кантэкст, Фабіян Ярэміч у Сейме выступіў супраць выдачы пяці беларускіх паслоў суду: „Trudna jest moja sytuacja, raz bowiem jestem jednym z tych, którzy byli bardzo ostro zwalczani przez Hromadę, a po wtóre nie jestem prawnikiem, nie mogę tak prawniczo ujmować rzeczy, jak to poprzedni mówcy prawnicy uczynili. Ja chcę powiedzieć tylko kilka słów jako Białorusin, jako przedstawiciel ludności białoruskiej, oraz kilka słów o polityce w stosunku do nas, Białorusinów, która niewątpliwie odgrywa tu główną rolę. Proszę Panów! Kiedy weszliśmy do Sejmu i byliśmy w Klubie, na czele którego stał poseł Taraszkiewicz, stanowiliśmy jedno ze stronnictw rządowych. Wtedy bagatelizowano ruch białoruski i nikt z nami nic nie mówił. Kiedy po niejakim czasie (...) ten ruch przybrał kolosalne rozmiary, kiedy zaczął się organizować, krystalizować, wtedy dopiero tylko zaczęto radzić w niektórych gabinetach nad tym, ażeby walczyć z tym ruchem. Od kilkunastu miesięcy polska prasa szowinistyczna podawała fałszywe wiadomości o nas i inspirowała rząd, ażeby jak najprędzej zlikwidował tzw. kramołę. (...) Ja uważam, że ta akcja jest akcją tępienia ruchu białoruskiego. (...) Ja uważam, że to postępowanie Rządu w stosunku do nas, Białorusinów, jest nie tylko błędne, ale i karygodne z punktu widzenia po prostu ludzkości. Do dziś Białorusini nie mają nawet elementarnych praw, nie mają szkół, nie mają nic, są prześla-

dowani przez policję i administrację. (...) A gdzie są rzeczy, które nam słusznie się należą, o których myśmy dziesiątki razy tu mówili? Nie jestem komunistą, ale muszę przyznać, że po tamtej stronie są rzeczy, z których Białorusini naprawdę mogą tworzyć coś narodowego. Tam dano szkoły. Choć nie mamy absolutnie praw politycznych, za to mamy autonomię szkolną i to nawet szeroką, mamy uniwersytet, mamy wyższą szkołę rolniczą, mamy tzw. technikum, a cóż mamy w Polsce? Czy kto widział, by w państwie europejskim, mającym mniejszość narodową, wynoszącą ponad 2,5 miliona, nie dano tej mniejszości ani jednej rządowej szkoły, ani jednego gimnazjum, ani jednego stypendium w uniwersytetach polskich! (...) Uważam panie Ministrze, że p. Minister nie da sobie rady, żeby tłumić ruch białoruski, i uważam, że nie tędy droga. Póki my nie zdobędziemy tego, co nam się słusznie należy, naszych praw kulturalnych, narodowych i politycznych, dopóty nie będziecie mieli spokoju i będziecie nas aresztowali, aż zmienicie swoją politykę. Będę głosował za niewydaniem wszystkich aresztowanych posłów" (317 posiedzenie Sejmu z 4.02.1927 r.).

Фабіян Ярэміч і Пётр Мятла ў студзені 1926 г. з экскурсіяй польскіх дэпутатаў наведалі Савецкі Саюз. Былі таксама ў Мінску. Фабіян Ярэміч вельмі крытычна ацэньваў сітуацыю ў савецкай Беларусі, асабліва нацыянальную палітыку, паводле якой апалячваліся тамтэйшыя католікі.

У Сейм у 1928 г., пасля разгрому Грамады, Фабіян Ярэміч увайшоў з дзяржаўнага спіска № 18 Блока нацыянальных меншасцей. Нягледзячы на рэпрэсіі і ануляванне спіскаў, беларусам удалося здабыць 11 месцаў у Сейме. Фабіян Ярэміч быў адзіным паслом, які меў за сабой парламенцкі вопыт з мінулага склікання. Зноў працаваў у адміністрацыйнай камісіі. Васіль Рагуля, пасол у 1922-1928 гг., стаў сенатарам. У 1928-1930 гг. беларускія паслы Фабіян Ярэміч ад Беларускага сялянскага саюза, Павел Каруза, Альбін Стаповіч, Кастусь Юхневіч ад Беларускай хрысціянскай дэмакратыі і сенатары Васіль Рагуля ды Вячаслаў Багдановіч былі ва ўкраінска-беларускім парламенцкім клубе. Пасля яго падзелу Фабіян Ярэміч узначаліў беларускі клуб. За 2 гады 10 разоў выступаў з сеймавай трыбуны. Вельмі крытычна адносіўся ён да палітыкі пасля майскага перавароту. Гаварыў пра сваё расчараванне Юзафам Пілсудскім і польскай лявіцай. На адным з першых пасяджэнняў Сейма, у дыскусіі над бюджэтам, даў дэкларацыю: „Świętym ideałem każdego narodu jest jego niepodległość. Jest to zdrowy i normalny pęd każdego zdolnego do życia organizmu narodowego. Urzeczywistnienie prawa samookreślenia narodów ominęło naród białoruski, który nieraz dał dowód swego niepodległościowego dążenia. Wobec tego my, jako reprezentujący szerokie masy siermiężnego narodu, stojąc na gruncie samookreślenia narodów, a pielęgnując w sercach swych ideał złączonej, niepodległej Białorusi, będziemy zawsze się zmagali o te ideały naszego narodu, które również są ideałami całej ludzkości. Niewielkiej naszej ilości w tej Izbie jednak wystarczy na to, aby z tej wysokiej trybuny zawsze głosić o wielkiej krzywdzie, jaka dzieje się narodowi białoruskiemu. Zaznaczamy swe negatywne stanowisko wobec obecnego rządu i głosować będziemy przeciwko prowizorium budżetowemu" (4 posiedzenie Sejmu z 30.03.1928 r.). „Reasumując wszystko i widząc, że w tym budżecie nie ma ani jednej pozycji, ani jednego grosza, ani na białoruską kulturę, ani na białoruską kooperację, ani na odbudowę, ja jako przedstawiciel narodu białoruskiego oświadczam, że będziemy głosowali przeciw budżetowi", — гаварыў на чарговым пасяджэнні Сейма 12 мая 1928 г. Вінаваціў таксама польскія ўлады ў праследзе беларусаў савецкай уладай, кажучы, што сваёй палітыкай да беларусаў даюць яны падставы для рэпрэсій беларускай інтэлігенцыі ў БССР.

У 1930 г., калі ніводзін з беларускіх нацыянальных дзеячаў не ўвайшоў у Сейм ды Сенат РП, з украінскага спіска № 11 быў выбраны Фабіян Ярэміч. Быў практычна адзіным прадстаўніком беларускага народа ў польскім парламенце. На працягу 5 гадоў 18 разоў выступаў у абароне правоў беларусаў у Польшчы, выказваўся пра здзекі ўлад, якія давялі да ліквідацыі беларускіх арганізацый. Вострыя выказванні сведчылі пра расчараванне беларускага пасла польскай дзяржавай: „Narodowi można siłą zabrać wszystko. Narodowi białoruskiemu zabrano ziemię i oddano osadnikom. Wyrwano najlepszych synów białoruskiego narodu i wtrącono do więzienia, albo wypędzono na banicję. (...) Zabrano białoruskie dzieci i posłano do szkoły polskiej i kazano Białorusinom za to jeszcze płacić. Zabiera się ostatnie kożuchy za podatki. (..) Oświadczam, że ani tym terrorem, ani deprawacją Panowie kwestii białoruskiej nie załatwicie. Pan myśli, Panie Prezesie Hołówko, że gdy tu nie stanie Białorusinów, to kwestia białoruska zostanie tam załatwiona. (...) Naród białoruski nie miał przedstawicieli do Gosudarstwiennoj Dumy, a jednak żył, żyje i upomni się o swoje prawa" (12 posiedzenie z 9.02.1931 r.). „Społeczeństwo białoruskie, widząc codziennie ten stosunek do siebie społeczeństwa polskiego i administracji, zasklepia się w sobie i nieufność jego — nie chcę użyć bardziej ostrego określenia — nie tylko nie zmniejsza się, lecz coraz więcej się potęguje. Przepaść między narodami polskim a białoruskim pogłębia się. I ten smutny fakt jest jedyną konsekwencją dotychczasowej polityki polskiej. Nie wiem, czy próbował kto w Polsce rozpatrzeć przebieg stosunków polsko-białoruskich, i zrobić odpowiedni bilans strat i zysków w tej dziedzinie. (...) Gdybym chciał najjaskrawiej zobrazować ten przebieg i rezultat polityki polskiej wobec narodu białoruskiego, nie znalazłbym lepszego bodaj przykładu, jak historia znanego Panom wybitnego przedstawiciela Białorusinów b. posła Taraszkiewicza. Niegdyś na wyzwoleńczych sztandarach polskich wypisane było złotymi literami hasło: „Za waszą i naszą wolność". Młody Taraszkiewicz — a czy tylko on jeden? — entuzjastycznie przejął się tym hasłem i jeszcze na ławach gimnazjalnych należał do nielegalnej organizacji polskiej (...) Ewolucja, którą przeszedł Taraszkiewicz, jest jednocześnie ewolucją szerokich mas białoruskich. I one odwróciły się od Polski, a swoje oczekiwania skierowały na wschód, będąc w zasadzie przeciw komunistom, jako masy chłopskie. Prawda, i tam nie ujrzały światła. Coraz więcej naród białoruski przekonywa się, że i w Rosji Sowieckiej tak samo niszczy się ruch białoruski. Słyszymy, że naszych działaczy narodowych, w tym i tych, którzy z Polski uciekli i którzy byli w Polsce zasądzeni na 12 lat katorgi, tam ich prawie wszystkich zamordowano lub zesłano do Sołówek. A w jakiej mierze może być pociechą dla Polski to, że i w Rosji bolszewickiej naród białoruski nie znalazł zadowolenia? Czy sądzą Panowie, że przez to samo, że w bolszewii nam jest źle, u nas zrodzi się przekonanie i poczucie, że tu w Polsce nam jest dobrze? Czy może zadowolić Was stwierdzenie metodą porównawczą, że w Rosji sowieckiej Białorusinom jest gorzej, niż w Polsce? Dla nas całkiem nieistotne jest takie porównanie, bo nic nam ono nie daje. Przecież zło, jeśli jest mniejsze od innego zła, nie staje się dobrem. (...) Uważam, że czas najwyższy skończyć z polityką eksterminacyjną wobec narodu białoruskiego, albowiem ta polityka i różnorodne eksperymenty na naszych ziemiach nic nie dały ani Państwu Polskiemu, ani narodowi białoruskiemu" (139 posiedzenie Sejmu z 6.02.1935 r.).

Помнік на магіле Фабіяна Ярэміча ў Калёніі пад Вільняй. Першая злева — Паўліна Вітушчанка, другая — Алеся Абрамовіч

Пасля выбараў у 1935 г. ужо не было ніводнага беларуса ў польскім парламенце. Арганізацыі амаль не існавалі — дзейнічаў адзіны Беларускі студэнцкі саюз як аўтаномнае універсітэцкае аб'яднанне. Чым займаўся тады Фабіян Ярэміч? Дзе працаваў? Вядома, што пабудаваў дом у віленскай Калёніі (зараз Павільнюс). Далажыў таксама свае сродкі да пабудовы касцёла там жа. „Шлях моладзі" змясціў інфармацыю пра смерць ягонага бацькі Мацея, памерлага 15 студзеня 1939 г. у Дуляўцах і пахаванага на могілках у Рэплі. Фабіян Ярэміч меў сына, які памёр малым, і дачку Валянціну, народжаную 2 верасня 1919 г. у Вільні. Якраз перад вайною пачала яна вучыцца на медыцынскім аддзяленні Віленскага універсітэта.

Адносна жыцця і дзейнасці Фабіяна Ярэміча можна ставіць шмат пытанняў. Захаваліся яго палымяныя сеймавыя прамовы, якія сведчаць пра яго незалежніцкі характар і пра яго заангажаванне ў беларускі нацыянальны рух. Захавалася ў бібліятэках „Сялянская ніва". Фабіян Ярэміч выгадаваў прынамсі аднаго свайго наступніка. Забраў у Вільню свайго 16-гадовага пляменніка Язэпа Найдзюка з Бойдатаў, які дзякуючы яму стаў актыўным беларускім дзеячам і кіраваў беларускай друкарняй. Стаў бацькам хросным дачкі Язэпа Рэгіны, якая зараз жыве ў Вільні.

Вядома, што пасля верасня 1939 г. Фабіян Ярэміч апынуўся ў Францыі. Што там рабіў? Вярнуўся адтуль у 1941 г., калі пачалася нямецка-савецкая вайна. Працаваў у адміністрацыі Мінска і Барысава, дзе быў бургамістрам. Удзельнічаў у II усебеларускім кангрэсе ў чэрвені 1944 г. у Мінску. Пасля вайны вярнуўся ў Вільню, дзе быў арыштаваны і сасланы ў турму, спярша ў Оршу, а пасля на ссылку ў Мардовію. Жонка з дачкой выехалі ў Варшаву. Адседзеўшы 10 гадоў, у 1956 г. вярнуўся ў родныя Дуляўцы, дзе падзякаваў сваім зводным братам і сёстрам за падтрымку ў ссылцы, куды яму пасылалі пачкі. Праседзеўшы год, паехаў па жонку ў Варшаву. Прабыў там пару месяцаў — у Польшчы яму не спадабалася. У Вільні меў жа свой вялікі дом, які, праўда, дзяржава нацыяналізавала пасля яго арышту. З дапамогай мужа свае хрэсніцы Рэгіны, які быў юрыстам, удалося вярнуць назад ад дзяржавы дом у Павільнюсе. Жыў там адзін. Адведвалі яго даўнія сябры. У сваёй хаце святкаваў 67 угодкі. Пётра Сергіевіч намаляваў ягоны партрэт.

На пахаванне прыехала з Варшавы дачка Валя. Прыйшлі даўнія сябры — беларусы, палякі, літоўцы, расіяне і яўрэі. Труна з ягоным целам была занесена на руках на павільнюскі могільнік. Пахаванне стала вялікай жалобнай народнай маніфестацыяй. Пасля смерці, па даручэнні дачкі, Рэгіна Найдзючанка прадала дом Фабіяна Ярэміча. У Павільнюсе асталася жыць ягоная пляменніца Марыся з Дуляўцаў, дачка зводнай сястры Уршулі, якую выдаў замуж за сына Адольфа Клімовіча. Памерла яна ў чэрвені гэтага года. Яшчэ год таму паспела яна расказаць пра свайго дзядзьку.

Зусім выпадкова ўдалося трапіць на ўнучку Фабіяна Ярэміча — Іаанну Жуброўскую, якая жыве ў Варшаве. Ад яе я даведалася, што Апалонія Ярэміч памерла ў 1980 г., а Валянціна, якая медыцыну закончыла пасля вайны ў Варшаве і працавала лекарам, памерла 29 чэрвеня 1990 г. — роўна 32 гады пасля смерці бацькі. Іаанна Жуброўская няшмат ведае пра свайго дзеда — яна толькі пачала цікавіцца сваім паходжаннем. Аднак, калі б пару гадоў таму назад яе дачка Магда не пасябравала з Пятром, прапраўнукам мінскага доктара Караля Яноўскага, магчыма што не было б сёння гэтай аповесці.

Успамінаючы Фабіяна Ярэміча ў 1958 г. на старонках „Źnicza" (№ 48, с. 4-5), які выдаваўся ў Рыме, Язэп Найдзюк (J. S-nok) пісаў: „Życie i praca św. P. Fabijana Jaremiča heta biazumoúna vialiki kavałak historyi zmahańnia Biełaruskaha narodu za lepšuju budučyniu. (...) Rasstaúsia z hetym śvietam vialiki biełaruski dziejač, zmahar, mučanik i vierny syn Biełarusi... Śpi spakojna, Darahi Druža! Śpi i śni ab Biełarusi, jakaja žyvie i žyć budzie viečna. (...) Biełarusy napeúna nie zabuduć pra Ciabie..."

Да 85-годдзя Канстанціна Майсені

Беларускі грамадска-культурны і гаспадарчы дзеяч

23 жніўня Канстанціну Майсеню (1923-2006) споўнілася б 85 гадоў з дня нараджэння. Ведаючы аб тым, што беларускі паэт Віктар Швед знаходзіўся з Ім у сяброўскіх адносінах, звярнуўся я да яго з просьбай адказаць на некалькі пытанняў. Успамін паэта аб Кастусю Майсені будзе змешчаны ў планаванай кніжцы пра будаўніка Беларускага музея ў Гайнаўцы.

— Паважаны спадар Віктар Швед, ва ўступе раскажыце крыху аб сабе і акалічнасцях, у якіх Вы пазнаёміліся з Майсенем.

— Аб сабе я магу толькі ўспомніць у кантэксце сувязей з асобай Кастуся Майсені. Закончыў ён Вышэйшую эканамічную школу ў Познані і стаў працаваць дырэктарам Эканамічнага тэхнікума ў Бельску-Падляшскім, у якім навучалася беларуская мова. У 1956 годзе Кастусь заснаваў Бельскі аддзел БГКТ і быў яго першым старшынёю. У 1957 годзе стаў я штатным працаўніком „Нівы" і цікавілі мяне ў першую чаргу асветныя справы. Кантактаваўся я з Кастусём у канцылярыі тэхнікума і ў Аддзеле БГКТ. 30 сакавіка 1958 года ў Беластоку адбыўся II З'езд БГКТ, на якім быў я выбраны сакратаром Галоўнага праўлення, а Кастусь Майсеня — членам Прэзідыума ГП БГКТ. І ад гэтага часу наша супрацоўніцтва штодзень мацавалася. Часта сустракаліся мы на розных пасяджэннях і калі пасяджэнне зацягнулася да позняй ночы і Кастусь Майсеня не меў чым ад'ехаць у Бельск, прымаў я яго на начлег у малюсенькім пакойчыку на гарышчы ў будынку ГП БГКТ, якое знаходзілася тады па вул. Маніфеста Ліпнёвага (сёння св. Роха) у Беластоку. У пакойчыку стаяў толькі вузенькі вайсковы ложак, на якім маглі мы змесціцца толькі шчыльна прытуліўшыся да сябе плячыма. Кастусь арганізаваў мне і Алесю Барскаму аўтарскія сустрэчы на Бельшчыне, у якіх часта сам прымаў удзел. Неўзабаве быў ён пераведзены на пасаду дырэктара будаўнічага прадпрыемства ў Бельску-Падляшскім і пабудаваў будынак сённяшняга беларускага ліцэя.

Неўзабаве непаседлівы Кастусь Майсеня пераехаў у Гайнаўку і ўзначаліў Павятовы саюз гмінных кааператываў „Сялянская самадапамога". Праявіў ён тут сябе як дасканалы будаўнік. Пад яго наглядам было ўзведзена больш за сотню крамаў у беларускіх вёсках Гайнаўшчыны. Помніцца мне, што з Кастусём Майсенем у маёй роднай вёсцы Мора выкапалі мы першыя сімвалічныя рыдлёўкі зямлі пад падмурак новай крамы і „майсенеўка", як яе называюць, працуе да сённяшняга дня. Гэтую неймаверную пабудову замацаваў я ў сваім вершы „Маякі", сцвярджаючы:

Быццам марскія маякі
Ноччу святлом яскравым свецяць
Аб'екты здольнае рукі —
Крамы ў Гайнаўскім павеце.

Зараз жа пасля заканчэння пабудовы крамаў Кастусь пачаў думаць аб беларускім этнаграфічным музеі. Дасканала ён ведаў беларускае асяроддзе Беласточчыны і бачыў, што на вачах умірае бясцэнная матэрыяльная беларуская культура. Пастанавіў ён сабраць найбольш цэнныя жамчужыны гэтай культуры і захаваць іх наступным пакаленням. Вышукаў ён адпаведны будынак у Белавежы. Пасля рамонту, праведзенага актывістамі БГКТ, і супольнага збору экспанатаў ад беларускага насельніцтва 12 сакавіка 1966 года быў адкрыты Беларускі этнаграфічны музей, які працаваў аж да яго ліквідацыі польскімі ўладамі ў маі 1973 года. На гэтую падзею я таксама адклікнуўся вершам „Беларускі музей":

Казалі нам, што ў вочы рэжа
І што псуе турыстам кроў
Музей няпольскі ў Белавежы,
Паміж дубоў, паміж зуброў.
Нялюдскім варварскім загадам,
Як крывадушнік-фарысей,
Хутка ліквідавалі ўлады
Этнаграфічны наш музей.
Даробак знішчылі багаты,
Нашых сяліб, нашай зямлі,
І унікаты-экспанаты
У Цехановец аддалі.

Аднак не спачыў Кастусь Майсеня пасля ліквідацыі нашага музея ў Белавежы. Пачаў ён думаць аб пабудове новага беларускага музея ў Гайнаўцы. Задума будаўніка здзейснілася. Адбылося так, як я сцвердзіў у сваім вершы:

І мы ўпорыста, гадамі,
З ахвяр грашовых землякоў
З натугаю будуем самі
У Гайнаўцы музей ізноў.
І ў павільёне ўжо гатовым,
Што вырас нам, як прыгажосць,
Музей мы ўжо адкрылі новы,
Усім працаўнікам на злосць.

— Якое ўражанне зрабіў на Вас Кастусь Майсеня?

— Кастусь Майсеня ачараваў мяне сваёй незвычайнай індывідуальнасцю. Уражваюць такія яго якасці як праўдзівасць, непакорнасць, працавітасць — праца для іншых, а не для сябе. Такія людзі нават у капіталізме ніколі не ўзбагацяцца матэрыяльна. Бескампрамісны змагар за беларускасць, за родную мову, за незалежнасць сваёй айчыны Беларусі. Нічога тады дзіўнага, што ўлады прымянялі захады жорсткай рэпрэсіі, выгнання чалавека за межы Беласточчыны. Таму зразумела, чаму так часта даводзілася Кастусю мяняць месца працы. Вяртаючыся ізноў на Беласточчыну, апынуўся ён як кіраўнік прадпрыемства здабычы торфу „Імшар" каля Міхалова. Ды дзе б яго не піхнулі, усюды ён паспяхова выконваў свае абавязкі. Заўсёды ўсімі сіламі імкнуўся выканаць пастаўленыя перад самім сабою задачы. Улады заўсёды навешвалі на Кастуся ярлык беларускага нацыяналіста. Помню партыйны сход працаўнікоў „Нівы" і БГКТ з удзелам адпаведных улад. Кастуся Майсеню абвінавацілі тады ў нацыяналізме, бо... гаворыць ён па-беларуску са сваім шафёрам. На гэты закід Кастусь спакойна адказаў: „А на якой жа я мове маю размаўляць з шафёрам-беларусам?" Усе прысутныя зарагаталі, спазіраючы на абвінаваўцу, які зрабіў з сябе пасмешышча.

— Пабудова Беларускага музея гэта ў першую чаргу заслуга Кастуся Майсені і дзеячаў ГП БГКТ у Польшчы. Разгарніце шырэй гэтае пытанне.

— Вядома, што гэтай аграмаднай працы не мог выканаць сам Кастусь Майсеня. Аднак усе апошнія не выканалі б гэтай працы без удзелу ахвярнага Кастуся. Ён самааддана ехаў грузавіком у Рэспубліку Беларусь, там ва ўлад вымольваў будаўнічыя матэрыялы і сядаў наверсе сваёй здабычы, абараняючы яе ўласным целам, нягледзячы на мароз ці сцюжу. Патраціў здароўе, доўга хварэў перад смерцю. Ахвярна апекавалася ім жонка Анастасія. Памёр славуты будаўнік, які пакінуў па сабе „нерукатворны помнік", пабудаваны яго розумам і сэрцам.

— Прыгадайце гісторыю пабудовы музея, Ваш асабісты ўклад, Вашых сяброў з Варшавы. Дзякуючы такім беларусам, а таксама беларусам з Беларусі і Злучаных Штатаў Амерыкі ў Гайнаўцы красуецца Беларускі музей — музей беларусаў усяго свету. Што Вы маглі б дадаць да гэтых слоў?

— Зразумела, што нельга пабудаваць музея толькі адным розумам і сэрцам, як я адказаў на папярэдняе пытанне. Патрэбная тут, безумоўна, фінансавая дапамога. Былі грошы ад польскіх улад. Была аграмадная дапамога Рэспублікі Беларусь у выглядзе будаўнічых матэрыялаў. Была таксама вялікая грашовая дапамога беларусаў, пражываючых у Амерыцы. Прывозілі з Амерыкі грошы Аляксандр Баршчэўскі і Мікалай Бушко. Беларускі дзеяч з Амерыкі Сяргей Карніловіч на мой хатні адрас прыслаў 500 долараў, якія я перадаў на пакупку цэглы для музея ў прадпрыемстве „Будаўнічая кераміка Ляўкова". Аляксандр Баршчэўскі і Хведар Галёнка з Варшавы ўплацілі на музей большыя сумы. Я таксама крыху ўплаціў. Збіраў я экспанаты і на аўтарскіх сустрэчах агітаваў сялян, каб перадавалі ў музей вартасныя прадметы. Чытаў я на аўтарскіх сустрэчах свае вершы, прысвечаныя беларускаму музею.

— Да сённяшняга дня гайнаўскія чыноўнікі, загадваючыя беларускім музеем, адвярнуліся плячыма, з вялікай заўзятасцю не рэалізуюць задання пабудовы пры музеі малой царкоўкі, якая прадугледжана ў плане пабудовы музея. Што Вы на гэта маглі б адказаць?

— Справа пабудовы царкоўкі пры беларускім музеі ў Гайнаўцы, здаецца, не ў кампетэнцыі чыноўнікаў. Магчыма, што гэтай справай мог бы заняцца гайнаўскі самаўрад, калі б радныя прынялі адпаведную пастанову і знайшлі спосаб прафінансавання гэтага мерапрыемства.

— На асноўнай сцяне беларускага музея знаходзіцца беларускі арнамент, які па-партацку запраектаваны і выкананы, пастаянна адпадаюць слаба прымацаваныя пліткі. Выглядае гэта страшэнна брыдка — насмешка над беларускім арнаментам. Уладальнікі беларускага музея ў той бок не глядзяць. Ці чыноўнікі павінны надалей здзекавацца над нашай культурай?

— Гэта сапраўды скандальная справа, якая ўжо цягнецца гадамі. Калі нельга прымусіць фірму, якая выконвала гэтую партацкую работу, для адрамантавання арнамента ўладальнікі музея павінны як найхутчэй знайсці адпаведныя фінансавыя сродкі на гэта, каб беларускі арнамент стаў сапраўды прыгожым, а не здзекам не толькі над арнаментам, але і над усімі намі, беларусамі. Вядомая пагаворка сцвярджае: як цябе бачаць, так цябе ацэньваюць і так аб табе пішуць. Гэта ж нашая візітка, якую бачыць кожны прахожы. Трэба зрабіць усё магчымае, каб славуты будаўнік музея Кастусь Майсеня і пасля смерці не мусіў ад роспачы пераварочвацца ў магіле. Мроіцца мне, каб наш музей не адштурхоўваў ад сябе сваім брыдкім выглядам, а каб прыгажэў і развіваўся. Каб збылося тое, аб чым я мару ў сваім вершы:

Музей — бясцэнная скарбніца,
Павінна багацець штогод.
Табою будзе ганарыцца
Заўсёды кроўны твой народ.
І маладыя пакаленні,
Якія прыйдуць у музей,
Скажуць, што Кастусь Майсеня
Музея слаўны карыфей.

— Шчыра дзякую за размову.

Гутарыў Віктар БУРА

Віктар Швед віншуе Канстанціна Майсеню з 80-гадовым юбілеем (Гайнаўка, 2003 г.)